Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 СТУДЗЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 18 (27876) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Больш за сем гадзін доўжыўся адкрыты дыялог Аляксандра Лукашэнкі з беларускімі і замежнымі журналістамі. Сустрэча прайшла ў новым фармаце — не звычайнай прэс-канферэнцыі, а адкрытага дыялогу, падчас якога журналісты як задавалі пытанні, так і выказвалі свае думкі па ўсіх кірунках, якія іх цікавілі.**

**У самым пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы адзначыў, што закрытых тэм няма, і выказаў гатоўнасць адказаць на ўсе пытанні, якія цікавяць прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ. «Паколькі праблем і пытанняў нямала, давайце адкрыта і канструктыўна пра гэта казаць»,— прапанаваў Прэзідэнт.**

**Усяго журналісты задалі некалькі дзясяткаў пытанняў, якія тычыліся самых розных тэм: знешняй і ўнутранай палітыкі Беларусі, эканамічнай і фінансавай сітуацыі ў краіне, дыверсіфікацыі экспарту, кадравай палітыкі і заробкаў, праблемных пытанняў у будаўніцтве і ЖКГ, карупцыі, рэагавання дзяржорганаў на крытыку СМІ, стасункаў чыноўнікаў з журналістамі. Размова датычылася ўкраінскай тэматыкі і ў цэлым праблематыкі забеспячэння бяспекі і міру. Гаворка ішла і аб супрацоўніцтве з Расіяй, аб узаемадзеянні ў рамках інтэграцыйных структур, у тым ліку Саюзнай дзяржаве, Еўразійскім эканамічным саюзе, а таксама аб адносінах з Захадам. Аляксандр Лукашэнка асаблівую ўвагу надаў супрацоўніцтву з Кітаем, а таксама шматлікім іншым тэмам.**

**Прэзідэнт на ўсе пытанні адказваў шчыра, адкрыта і падрабязна.**



Фота БЕЛТА.

# КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ БЕЗ ЗАКРЫТЫХ ТЭМ

## Асаблівы год

Адкрываючы сустрэчу, Прэзідэнт адзначыў, што мінулы год быў багаты на падзеі і на перамогі беларускіх спартсменаў, сярод якіх паспяховае выступленне на Алімпіядзе ў Сочы — упершыню ў гісторыі быў такі вынік. У ліку важных дасягненняў — паспяховае правядзенне ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі. Гэта лепшы чэмпіянат свету, як прызналі замежныя партнёры.

Упершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі беларускія аграрыі змаглі атрымаць рэкордна высокі ўраджай.

Прэзідэнт падкрэсліў, што 2014 год быў у Беларусі не толькі Годам гасціннасці, але і годам памяці, патрыятызму, 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «На вялікі жаль, 2014 год быў адзначаны і эскалацыяй міжнароднай напружанасці не толькі ў суседняй роднай нам Украіне, але і ў многіх пунктах нашай планеты,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.— Тым не менш трагедыя брацкага народа прымусіла нас яшчэ раз задумацца аб тым, наколькі важна, каб у краіне былі мір, спакой і парадак».

Ён адзначыў, што Беларусь, Расію і Украіну аб'ядноўваюць цесныя гістарычныя, культурныя і эканамічныя сувязі. «Разарваць гэтыя сувязі нельга, і наўрад ці гэта каму-небудзь сёння дазволена і наогул магчыма. Мне хацелася б, каб год 70-годдзя Вялікай Перамогі, гэты год, стаў для нашых народаў напамінам аб тым, што толькі разам, плячо ў плячо мы можам перажыць цяжкія часы і процістаяць любым самым страшным пагрозам».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што з 1 студзеня пачаў работу важнейшы інтэграцыйны праект — Еўразійскі эканамічны саюз, да якога Беларусь разам са сваімі партнёрамі ішла на працягу некалькіх гадоў.

«Мы абавязаны выкарыстоўваць магчымасці, якія адкрываюцца перад намі ў рамках гэтага інтэграцыйнага праекта»,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён запэўніў, што Беларусь будзе ўсяляк садзейнічаць паглыбленню інтэграцыі, стварэнню раўнапраўнага саюза без выключэнняў і абмежаванняў. Тым больш што Беларусь у першы год работы новага інтэграцыйнага праекта з'яўляецца старшынёй ЕАЭС.

## У цэнтры ўвагі быў і будзе чалавек

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што да канца свайго прэзідэнцтва не адмовіцца ад сацыяльна арыентаванай мадэлі ў развіцці дзяржавы.

«Тая мадэль, якая была ў нас з вамі і існуе да гэтага часу, мы ад яе ні ў якім разе не адмаўляемся. Мы называем яе сацыяльна арыентаванай, гэта значыць у цэнтры знаходзіцца чалавек. Я ад яе не адмоўлюся да канца свайго прэзідэнцтва. Мы гэту мадэль намацалі, мы гэту мадэль стварылі, мы гэты шлях вызначылі і па ім трэба ісці, не шарахаючыся, асабліва ў перыяд крызісу»,— адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт канстатаваў, што імкненне чалавецтва, асобных грамадстваў і людзей да перамен жыве ў крыві і гэта натуральна. «Але як кіраўнік дзяржавы, які адказвае за мільёны людзей, у тым ліку гэта паўплывае і на нашых суседзяў пэўным чынам, я не маю права паддавацца такім эмоцыям. Я таксама хацеў бы перамен, здзівіць я магу любой мадэллю. Але ці гатовы вы ўспрыняць гэту мадэль? Ці гатова грамадства да тых вялікіх навацый, якія могуць прапанаваць палітыкі, у тым ліку і я? Думаю, што не заўсёды»,— падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб стане спраў у эканоміцы Беларусі пасля распаду СССР, калі людзі заходзілі ў магазін як у пустыню, калі на руках былі прадуктовыя талоны, за якія складана было атрымаць тавар.

СТАР. 2-4

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 3° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | + 2° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.01.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15360,00 | ▲ |
| Еўра | 17340,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 224,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 964,87 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

# Прырода «сваволіць» цяплом

## А ў панядзелак на ўсходзе краіны прагназуюцца моцныя снегапады

**У найбліжэйшыя суткі на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца пераважна цёплае надвор'е з невялікімі ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, паведаміла <u>спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.</u>**

Месцамі слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Удзень у асобных раёнах узмоцніцца вецер парывамі да 15–18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 1 градуса па поўначы, да плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе Беларусі. У выхадныя пад уплывам актыўных атмасферных франтоў, што рухаюцца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы, чакаюцца складаныя ўмовы надвор'я. Часам будзе ісці мокры снег і дождж. У суботу ў большасці раёнаў — мокры снег. Месцамі па краіне — ападкі моцныя. 31 студзеня амаль паўсюдна, а 1 лютага месцамі — узмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 1–7 цяпла. А ў нядзелю стане ўжо халадней. Уначы чакаецца ад мінус 5 да 1 градуса цяпла, а ўдзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

Няўстойлівае надвор'е чакаецца ў краіне і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак паўсюдна пройдзе снег і мокры снег. Месцамі па ўсходняй палове Беларусі прагназуюцца моцныя снегапады. У асобных раёнах — завея і ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак складзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, бліжэй да сярэдзіны наступнага тыдня стане яшчэ халадней. Уначы на аўторак у большасці раёнаў, а ў сераду месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Тады ўначы падмарозіць да мінус 1–7 градусаў, пры праясненнях — да мінус 9. Удзень прагназуецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. А вось стабільных і сур'ёзных маразоў сінооптыкі пакуль і ў лютым не прадказваюць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ» — МІНІСТР КУЛЬТУРЫ



**Сёння, 30 студзеня, з 10.00 да 11.00** у «Звяздзе» пройдзе «прамая» тэлефонная лінія з міністрам культуры Рэспублікі Беларусь Барысам Уладзіміравічам Святловым. Папярэднія пытанні можна даслаць на электронны адрас **info@zvyazda.minsk.by** з пазнакай «Прамая лінія» ці агучыць па тэлефоне **287-18-51**. Падчас «прамой лініі» свае пытанні міністру культуры можна задаць па тэлефоне **287-18-71**.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 СТУДЗЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 18 (27876) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Больш за сем гадзін доўжылася размова Аляксандра Лукашэнкі з беларускімі і замежнымі журналістамі. Сустрэча прайшла ў новым фармаце — не звычайнай прэс-канферэнцыі, а адкрытага дыялогу, падчас якога журналісты як задавалі пытанні, так і выказвалі свае думкі па ўсіх кірунках, якія іх цікавілі.**

**У самым пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы адзначыў, што закрытых тэм няма, і выказаў гатоўнасць адказаць на ўсе пытанні, якія цікавяць прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ. «Паколькі праблем і пытанняў нямала, давайце адкрыта і канструктыўна пра гэта казаць»,— прапанаваў Прэзідэнт.**

**Усяго журналісты задалі некалькі дзясяткаў пытанняў, якія тычыліся самых розных тэм: знешняй і ўнутранай палітыкі Беларусі, эканамічнай і фінансавай сітуацыі ў краіне, дыверсіфікацыі экспарту, кадравай палітыкі і заробкаў, праблемных пытанняў у будаўніцтве і ЖКГ, карупцыі, рэагавання дзяржорганаў на крытыку СМІ, стасункаў чыноўнікаў з журналістамі. Размова датычылася ўкраінскай тэматыкі і ў цэлым праблематыкі забеспячэння бяспекі і міру. Гаворка ішла і аб супрацоўніцтве з Расіяй, аб узаемадзеянні ў рамках інтэграцыйных структур, у тым ліку Саюзнай дзяржаве, Еўразійскім эканамічным саюзе, а таксама аб адносінах з Захадам. Аляксандр Лукашэнка асаблівую ўвагу надаў супрацоўніцтву з Кітаем, а таксама шматлікім іншым тэмам.**

**Прэзідэнт на ўсе пытанні адказваў шчыра, адкрыта і падрабязна.**

# КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ БЕЗ ЗАКРЫТЫХ ТЭМ



Фота БЕЛТА.



## Асаблівы год

Адкрываючы сустрэчу, Прэзідэнт адзначыў, што мінулы год быў багаты на падзеі і на перамогі беларускіх спартсменаў, сярод якіх паспяховае выступленне на Алімпіядзе ў Сочы — упершыню ў гісторыі быў такі вынік. У ліку важных дасягненняў — паспяховае правядзенне ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі. Гэта лепшы чэмпіянат свету, як прызналі замежныя партнёры.

Упершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі беларускія аграрыі змаглі атрымаць рэкордна высокі ўраджай.

Прэзідэнт падкрэсліў, што 2014 год быў у Беларусі не толькі Годам гасціннасці, але і годам памяці, патрыятызму, 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «На вялікі жаль, 2014 год быў адзначаны і эскалацыяй міжнароднай напружанасці не толькі ў суседняй роднай нам Украіне, але і ў многіх пунктах нашай планеты,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.— Тым не менш трагедыя брацкага народа прымусіла нас яшчэ раз задумацца аб тым, наколькі важна, каб у краіне былі мір, спакой і парадак».

Ён адзначыў, што Беларусь, Расію і Украіну аб'ядноўваюць цесныя гістарычныя, культурныя і эканамічныя сувязі. «Разарваць гэтыя сувязі нельга, і наўрад ці гэта каму-небудзь сёння дазволена і наогул магчыма. Мне хацелася б, каб год 70-годдзя Вялікай Перамогі, гэты год, стаў для нашых народаў напамінам аб тым, што толькі разам, плячо ў плячо мы можам перажыць цяжкія часы і процістаяць любым самым страшным пагрозам».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што з 1 студзеня пачаў работу важнейшы інтэграцыйны праект — Еўразійскі эканамічны саюз, да якога Беларусь разам са сваімі партнёрамі ішла на працягу некалькіх гадоў.

«Мы абавязаны выкарыстоўваць магчымасці, якія адкрываюцца перад намі ў рамках гэтага інтэграцыйнага праекта»,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён запэўніў, што Беларусь будзе ўсяляк садзейнічаць паглыбленню інтэграцыі, стварэнню раўнапраўнага саюза без выключэнняў і абмежаванняў. Тым больш што Беларусь у першы год работы новага інтэграцыйнага праекта з'яўляецца старшынёй ЕАЭС.

## У цэнтры ўвагі быў і будзе чалавек

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заяўляе, што да канца свайго прэзідэнцтва не адмовіцца ад сацыяльна арыентаванай мадэлі ў развіцці дзяржавы.

«Тая мадэль, якая была ў нас з вамі і існуе да гэтага часу, мы ад яе ні ў якім разе не адмаўляемся. Мы называем яе сацыяльна арыентаванай, гэта значыць, у цэнтры знаходзіцца чалавек. Я ад яе не адмоўлюся да канца свайго прэзідэнцтва. Мы гэту мадэль намацалі, мы гэту мадэль стварылі, мы гэты шлях вызначылі і па ім трэба ісці, не шарахаючыся, асабліва ў перыяд крызісу»,— адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт канстатаваў, што імкненне чалавецтва, асобных грамадстваў і людзей да перамен жыве ў крыві і гэта натуральна. «Але як кіраўнік дзяржавы, які адказвае за мільёны людзей, у тым ліку гэта паўплывае і на нашых суседзяў пэўным чынам, я не маю права паддавацца такім эмоцыям. Я таксама хацеў бы перамен, здзівіць я магу любой мадэллю. Але ці гатовы вы ўспрыняць гэту мадэль? Ці гатова грамадства да тых вялікіх навацый, якія могуць прапанаваць палітыкі, у тым ліку і я? Думаю, што не заўсёды»,— падкрэсліў ён.

СТАР. 2-4

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 3° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | + 2° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.01.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15360,00 | ▲ |
| Еўра | 17340,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 224,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 964,87 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

# Прырода «сваволіць» цяплом

## А ў панядзелак на ўсходзе краіны прагназуюцца моцныя снегапады

**У найбліжэйшыя суткі на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца пераважна цёплае надвор'е з невялікімі ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Месцамі слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Удзень у асобных раёнах узмоцніцца вецер парывамі да 15–18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 1 градуса па поўначы, да плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе Беларусі. У выхадныя пад уплывам актыўных атмасферных франтоў, што рухаюцца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы, чакаюцца складаныя ўмовы надвор'я. Часам будзе ісці мокры снег і дождж. У суботу ў большасці раёнаў — мокры снег. Месцамі па краіне — ападкі моцныя. 31 студзеня амаль паўсюдна, а 1 лютага месцамі — узмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 1–7 цяпла. А ў нядзелю стане ўжо халадней. Уначы чакаецца ад мінус 5 да 1 градуса цяпла, а ўдзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

Няўстойлівае надвор'е чакаецца ў краіне і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак паўсюдна пройдзе снег і мокры снег. Месцамі па ўсходняй палове Беларусі прагназуюцца моцныя снегапады. У асобных раёнах — завея і ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак складзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, бліжэй да сярэдзіны наступнага тыдня стане яшчэ халадней. Уначы на аўторак у большасці раёнаў, а ў сераду месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Тады ўначы падмарозіць да мінус 1–7 градусаў, пры праясненнях — да мінус 9. Удзень прагназуецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. А вось стабільных і сур'ёзных маразоў сіноптыкі пакуль і ў лютым не прадказваюць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ» — МІНІСТР КУЛЬТУРЫ



**Сёння, 30 студзеня, з 10.00 да 11.00** у «Звяздзе» пройдзе «прамая» тэлефонная лінія з міністрам культуры Рэспублікі Беларусь Барысам Уладзіміравічам Святловым. Папярэднія пытанні можна даслаць па электронны адрас **info@zvyazda.minsk.by** з пазнакай «Прамая лінія» ці агучыць па тэлефоне **287-18-51**. Падчас «прамой лініі» свае пытанні міністру культуры можна задаць па тэлефоне **287-18-71**.

# КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб стане спраў у эканоміцы Беларусі пасля распаду СССР, калі людзі заходзілі ў магазін як у пустыню, калі на руках былі прадуктовыя талоны, за якія складана было атрымаць тавар. «З таго часу мы пакрыху аднаўлялі нашу эканоміку. Мы тое, што лепшае засталося нам ад Савецкага Саюза, ад той эканомікі, паднялі з калень, таму што іншага ў нас не было. Рэфарматараў было шмат, якія заклікалі зрабіць так, як у Расіі, як цяпер ва Украіне. Але цяпер жа мы разумныя, цяпер жа многія разумеюць, што мы ні ў якім разе не павінны былі ісці тым шляхам абвальнай прыватызацыі, бо мы парадзілі б алігархічны капіталізм і мелі б усе вынікі гэтага капіталізму»,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, аднаўленне эканомікі праходзіла не без праблем, існуюць праблемы і цяпер. «Але яны пароджаны не намі. Калі вы аб'ектыўныя, то разумееце, што цяперашні стан, ды і мінулы крызіс, былі знешнімі. Свет, дарэчы, не выйшаў з крызісу. Так, Амерыка «задыхала», Кітай больш-менш. Усё астатняе ў нас яшчэ не паднялося. І дабавілася бяда, крызіс нашых суседзяў, з якімі мы гістарычна, эканамічна і фінансава звязаны»,— адзначыў Прэзідэнт.

## Рубель у свабодным плаванні…

Адпусціць беларускі рубель у свабоднае плаванне давялося з-за валютнага ажыятажу з боку насельніцтва, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў: першапачаткова аб тым, каб дэвальваваць нацыянальную валюту ў канцы мінулага года, размова не ішла. «Мы ж не збіраліся гэтага рабіць у канцы мінулага года. Я вам абсалютна сумленна аб гэтым кажу. Я вам намякнуў: усё залежыць ад вас. Калі вы пачніце бегаць ад абменніка да абменніка і мяняць беларускія рублі на валюту, то зразумела, мы не будзем чакаць, пакуль у нас наогул апустошаца запасы ў Нацыянальным банку і не будзе золатавалютнага рэзерву. Вядома, вы, насельніцтва і прадпрыемствы, нас штурхнеце, што мы вымушаны будзем у нейкай ступені адпусціць нацыянальную валюту ў свабоднае плаванне. Што давялося і зрабіць»,— адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Вяртаючыся да тэмы сацыяльна арыентаванай мадэлі развіцця беларускай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што яе «не трэба ламаць». «Ведаючы прычыны цяжкага становішча, вытрымаўшы гэта, чаго б нам ні каштавала, трэба проста праводзіць свой курс, ісці сваёй дарогай»,— сказаў Прэзідэнт, звярнуўшы ўвагу, што беларускую мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця капіруюць многія краіны.

## Улада не рабіла глабальных памылак

«Я часта аналізую тое, што раблю. І вельмі часта займаюся самаедствам. Але мне здаецца, што мы не рабілі нейкіх глабальных памылак, мы ніколі не развязвалі вайну, мы нідзе не зрабілі так, каб пацярпела мора людзей»,— канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт прызнаў, што, магчыма, у некаторых складаных эканамічных сітуацыях была недакладная або няправільная рэакцыя. «Але гэта таму, што ў нас не было вопыту такога, таму што ў нас не было дзяржавы, мы гэта ўсё не праходзілі. Расіяне гэта праходзілі, ім прасцей. Там улада была ў Крамлі, там быў гэты вопыт, ім крыху лягчэй»,— растлумачыў ён.

У цэлым кіраўнік дзяржавы адмаўляе наяўнасць у Беларусі кадравага голаду на кіруючых кадры. «Іерархія выбудавана такім чынам, што ключавыя ў краіне з'яўляюцца, акрамя прэзідэнцкай, пасады прэм'ер-міністра, міністраў і губернатараў. І людзі прасоўваюцца па службовай лесвіцы знізу ўверх»,— сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, новыя назначэнні не з'яўляюцца паказчыкам голаду на кадры, таму што здольны справіцца з работай на ключавых пасадах адзінкі. «Вы б ведалі, колькі мы праверылі кадраў, выбіраючы лепшых»,— прызнаўся кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што сярод новых назначэнцаў ёсць і маладыя людзі, якія літаральна ўзляцелі наверх. «Але ў іх мала «нізу», гэта недахоп»,— дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы не рэагуйце такім чынам, што тасуюць старую калоду,— звярнуўся Прэзідэнт да журналістаў.— Старая або новая, гэта калода, яна для таго і ёсць, каб тасаваць. І лепшых адтуль падымаць уверх, горшых скідваць у адбой, груба кажучы (але гэта вы тэрмін прапанавалі, сам я ў адбой нікога не скідваю)».

«У нас ёсць чым заняцца кожнаму. Для некаторых яшчэ шукаем работу, таму што мае прапановы ім не падышлі»,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Існуе меркаванне (не столькі ў нас, колькі ў іншых краінах), што ёсць нейкія групоўкі, групы па інтарэсах, якія прасоўваюць сваіх на ўладу. У Беларусі гэта немагчыма,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.— Прасунуць можна толькі да ўзроўню Прэзідэнта: прыйдзі і пакладзі на стол плюсы і мінусы свайго пратэжэ, а потым я трох ведамствам даручу пераправерыць. Атрымаўшы ад іх інфармацыю, сам усё перачытаю, падлічу. У мяне ёсць вопыт, каб вывучыць чалавека пры назначэнні, ёсць інтуіцыя за столькі гадоў. Я магу тысячу разоў раіцца, задаваць пытанні перад назначэннем, але прымаю рашэнне сам. Таму няма ніякага лабіравання ў плане падпісання ўказаў па кадрах».


Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт асабліва адзначыў, што нельга прымаць такія кадравыя рашэнні, ад якіх потым будуць цярпець і мільёны людзей, і краіна, і яе суседзі. «У мяне тармаз гэты ёсць»,— дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка шчыра расказаў у час адкрытага дыялогу з журналістамі, чым ён кіраваўся пры назначэнні на ключавыя пасады ў дзяржаве. Так, Прэзідэнт лічыць Аляксандра Косінца «вучоным чалавекам, які ведае жыццё як ніхто», раней ён быў губернатарам, да гэтага — віцэ-прэм'ерам. «Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, які ўзначальвае палітычны штаб, павінен ведаць, што адбываецца там, унізе»,— лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Цяперашняга прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова Прэзідэнт ахарактарызаваў як чалавека, які ведае эканоміку на мікра- і макраўзроўні дзякуючы рабоце на многіх важных пасадах. «Яго папярэдняе назначэнне на пасаду кіраўніка Адміністрацыі — мой свядомы ход: калі ён вытрымае, то чагосьці варты, паколькі гэта самая цяжкая пасада: не дай бог нешта не так — пры маім характары і пры маім стаўленні,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.— Эканоміка, фінансы для нас найважнейшае пытанне. Вядома, прэм'ер-міністрам назначылі эканаміста, які прайшоў знізу даверху».

«Я ведаю недахопы Андрэя Уладзіміравіча Кабякова. Ведаю і недахопы Косінца,— дадаў Прэзідэнт.— І мне не цяжка пры цяперашняй сістэме ўлады ўтрымліваць і Кабякова, і Косінца ад лішніх паваротаў».

Гаворачы пра віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашку, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Пры ўсіх адмоўных нюансах у плане характару гэта вельмі кваліфікаваны, талковы спецыяліст, прафесіянал, ён ведае ўсё — сапраўдная энцыклапедыя. І ён як бульдог у перагаворах — не ўступіць нікому сваёй пазіцыі, і гэта ўсё аргументавана. Для краіны Сямашка на гэтым месцы — лепшы. Яму прапаноўваліся і іншыя пасады, але ён пажадаў застацца на рабоце ва ўрадзе». «Чаму я павінен рызыкаваць, назначаючы новага чалавека, не ведаючы, ці ўзнімецца ён да ўзроўню Сямашкі, скажам, у бліжэйшыя два гады?!» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы.

Вельмі вопытным чалавекам ён назваў і цяперашняга намесніка прэм'ер-міністра Наталлю Качанаву і паведаміў, што прапанова аб яе кандыдатуры паступіла ад сілавых структур. «Я даручыў Андрэйчанку (старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.— **Заўвага БЕЛТА**): разбярыцеся, далажыце пісьмова. Ён прадставіў водзывы толькі станоўчыя. Першы раз — паўтара або год таму — я гэту папку з дакументамі адклаў. Калі настаў час назначаць урад, кандыдатура Качанавай імгненна ўсплыла — і зноў ад сілавых структур. Разабраўся, вывучыў, паглядзеў. Бачу: так, людзі пра яе добра гавораць, улічыў і шэраг іншых момантаў». «Яна натуральным шляхам прыйшла да гэтай пасады, сумленна працуючы на сваім рабочым месцы»,— рэзюмаваў Прэзідэнт.

Ён прызнаў, што хацеў бы бачыць больш жанчын на высокіх пасадах. «Але вельмі перажываю, баюся за іх, калі яны становяцца кіраўнікамі. Там і сям'я, і дом, і настрой мужа, і настрой дзяцей, не мне вам расказваць. А тут яшчэ яна — першая асоба, такі хамут і ззаду трохкорпусны плуг, які трэба цягнуць. Гэта мяне часам стрымлівае. Але жанчынам, няхай мужыкі не крыўдуюць, я давяраю больш»,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## Цэны — пад кантролем

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што даручыў вывучыць стан цэн на прадукты харчавання ў Беларусі ў параўнанні з расійскімі. «Быў перыяд, калі цэны ў Беларусі на тавары былі ў 2–3 разы ніжэйшыя, чым у Расіі. І нам каштавала страшных намаганняў перааодлець такую з'яву, як вываз прадукцыі з краіны, асабліва з прыгранічных раёнаў,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.— Мы былі вымушаны ў сувязі з гэтым трымаць парытэт цэн».

Гаворачы аб сённяшняй сітуацыі, Прэзідэнт адзначыў: «Але не думаю, што цяпер можа быць вельмі вялікая розніца ў цэнах у Беларусі і Расіі. Мы трымаем цэны крыху таннейшыя, чым у вас (у Расіі.— **Заўвага БЕЛТА**). Вы не можаце кантраляваць цэны — у вас няма такіх рычагоў і такой структуры, вы іх даўно ліквідавалі. А мы можам кантраляваць цэны, аж да сельскага магазіна. Улада заўсёды трымае гэтыя пытанні пад кантролем і рэгулюе іх».

«Калі цэны ў нас будуць ніжэйшыя, тавар вывезуць, калі будуць вышэйшыя — нашы людзі паедуць да вас па тавар»,— сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да расійскага журналіста, які задаваў пытанне. Прэзідэнт даў даручэнне вывучыць існуючае становішча і далажыць яму параўнальны аналіз цэн у Беларусі і Расіі.

## Папулізму ў сферы зарплаты не будзе

«Цэны ў дзяржаве мы ўзялі пад кантроль, робім гэта разумна,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.— У доларавым эквіваленце зарплата ўпала, ну і што? Вось калі б цэны выраслі на 30–40 працэнтаў, тады іншае пытанне, тады сапраўды можна гаварыць аб зніжэнні дабрабыту людзей».

Паводле яго слоў, у мінулым годзе ўпершыню за апошнія гады ўдалося дабіцца таго, што рост прадукцыйнасці працы быў вышэйшы, чым рост заробітнай платы. «Апераджальны рост зарплаты над прадукцыйнасцю працы ў нас зацягнуўся недапушчальна доўга — на чатыры або пяць гадоў. Цяпер мы прывялі гэтыя параметры ў адпаведнасць, і нам трэба што б там ні было гэта ўтрымаць. Калі мы будзем з'ядаць больш, чым вырабілі — у грашовым выражэнні, зразумела, то якая будзе эканоміка?» — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. Разам з тым, дадаў ён, гэта не азначае, што зарплата ў краіне не будзе расці. «Ёсць у прадпрыемства даходы — плаціце, ніхто не будзе стрымліваць. У бюджэтнай сферы прынцып такі: ёсць грошы — плацім, няма грошай — трэба пацярпець. Ніякай папулісцкай палітыкі пад выбары не будзе,— падкрэсліў Прэзідэнт.— Мы ўжо забылі, дзе друкарскі станок стаіць. Недапушчальна, каб мы яго ўключылі і пачалі друкаваць грошы».

У той жа час кіраўнік дзяржавы заявіў, што ўлады маюць намер жорстка спыняць выплату заработнай платы ў канвертах. «Зарплата ў канвертах — з'ява ненармальная. Такая праблема існуе, будзем разглядаць гэта пытанне,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.— Я даў распараджэнне падумаць аб тым, як вывесці з цені плацяжы і заработную плату. І мы гэта зробім».

Прэзідэнт запэўніў, што ў выпадку падрыхтоўкі адпаведнага нарматыўнага дакумента ён не будзе «скрыты ад людзей, без публічнасці гэта пытанне не вырашым».

## Пакончыць з «беспарадкам у будаўніцтве»

Прэзідэнт сказаў, што будзе жорстка рэагаваць на «беспарадак у будаўніцтве». «Я не пацярплю такога беспарадку ў будаўніцтве, як гэта было апошнія гады. Разбасячыліся, сорамна проста. Які аб'ект дзяржаўны не прымаюць, то пачынаюць потым каштарысы правяраць: усюды падман… Не ведаю, можа, і дзяржслужачыя тут замешаны, як карупцыянеры. Пачынаем разбірацца, пачынаем саджаць, пачынаем кампенсаваць дзяржаве ўрон, які нанесены… У будаўніцтве ў нас непарадку і недысцыплінаванасці больш, чым у любой іншай сферы»,— адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Не навядуць парадак (будаўнікі ў сваёй сферы.— **Заўвага БЕЛТА**) — паадкручваем галовы. Хопіць на іх глядзець, каб яны разбойнічалі і крыўдзілі людзей»,— таксама сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 1990-я пасля заняпаду ў будсферы было зроблена многае, каб яе аднавіць. У тым ліку была наладжана вытворчасць неабходнай тэхнікі. Цяпер галіна забяспечана ўсім.

«З Расіі паток назад пайшоў»,— таксама канстатаваў Прэзідэнт, маючы на ўвазе вяртанне беларускіх будаўнікоў, якія паехалі на заробкі ў Расію. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што не трэба цяпер з гэтай прычыны звальняць каго-небудзь з беларускіх бударганізацый, каб уладкаваць на работу тых, хто вярнуўся. «Паехалі ў свой час за доўгім рублём. Цяпер вярнуліся. Тут сёння таксама рынак сціснуўся. Работы ўжо не столькі. Няхай шукаюць. Я даў такія ўказанні»,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## У адукацыі трэба навесці парадак

«У адукацыі трэба навесці парадак, а не нейкія рэформы пыліць. Трэба вызваліць выкладчыкаў і настаўнікаў ад неўласцівых ім функцый і даць ім магчымасць займацца адукацыяй і выхаваннем. Якія палітычныя, эканамічныя і фінансавыя справаздачы могуць быць у настаўнікаў?» — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў тэму беларусізацыі адукацыі. «Не навязвайце настаўнікам, на якой мове ім гаварыць і выкладаць. Цяпер беларускай мовы ў школе хапае. Я ўжо вам гаварыў, што аднойчы паглядзеў — англійскай мовы пяць гадзін у чацвёртым класе, а беларускай — тры або чатыры. Як так? Дадалі»,— адзначыў ён.

## Пытанне «мовы» вырашана раз і назаўсёды

Тэма гэтая, сказаў Прэзідэнт, будзе закрыта як мінімум да заканчэння прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі. У краіне застануцца дзве дзяржаўныя родныя мовы — беларуская і руская. Беларускі лідар падкрэсліў, што ніводны міністр не можа ісці ўразрэз з гэтай палітыкай. «Я катэгарычна забараніў усялякі націск па моўнай прыкмеце»,— звярнуў увагу ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што руская мова нараўне з беларускай з'яўляецца здабыткам нацыі. «Наш народ нямала ўнёс у скарбонку рускай мовы і нямала выпакутаваў, каб яна была роднай. Я і пераважная большасць беларусаў лічым рускую мову роднай. Гэта спадчына і багацце, ад якога мы адмаўляцца не павінны»,— зазначыў ён.

Разам з тым Прэзідэнт падкрэсліў, што падтрымлівае беларускую мову. «Яна робіць адметнымі нас ад расіян. Наяўнасць сваёй мовы — гэта прыкмета нацыі. Мы ні ў якім разе не павінны загубіць беларускую мову. Мы павінны ведаць як яе, як і рускую. Яна будзе найвялікшым здабыткам кожнага беларуса. Я не хачу, каб ён быў страчаны. Гэта даражэй за любыя крэдыты і мільярды. У мяне расце малы, і я хачу, каб ён ведаў беларускую мову гэтак жа, як і рускую»,— дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што асобныя людзі ў Расіі могуць напружвацца, што ў нашай краіне праходзіць мяккая беларусізацыя, але гэта не значыць, што так думае ўвесь рускі народ і яго ўрад.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што трагічныя падзеі ва Украіне пачаліся з бязмозглай нацыянальнай палітыкі і перш за ўсё

# БЕЗ ЗАКРЫТЫХ ТЭМ

з пытання па мове. «Я ўмею рабіць высновы. І я сёння рады, што ў свой час мне ўдалося спыніць шалёны нацыяналізм, які быў да майго прэзідэнцтва. Я часта жартам кажу, але, напэўна, у гэтым ёсць нейкая доля праўды: мы, беларусы, такія разумныя, талерантныя і мудрыя, таму што ў нашых жылах змяшана шмат крыві — беларуская, руская, украінская, польская, яўрэйская і нават татарская», — рэзюмаваў ён.

## Чужых зямель нам не трэба...

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў свой час гаварыў аб ядзернай зброі, якая была выведзена з тэрыторыі Беларусі, і аб тым, што быў вымушаны выконваць прынятае не ім рашэнне. «Я прама і шчыра скажу, за што мяне крытыкавалі: калі б гэта была мая воля, асабліва цяпер, я ніколі б гэтага не зрабіў. Вы бачыце, што адбываецца ў свеце: у каго сіла — той і мае рацыю», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

У гэтай сувязі ён адзначыў: «Мы працуем над тым, каб у Беларусі была свая зброя. Цяпер асноўная вытворчасць зброі, якой карыстаецца наша армія, сканцэнтравана ў Расіі. Мы толькі ствараем некаторыя часткі зброі: электроніка, оптыка і іншыя. Нам трэба мець добрую зброю, каб будучы агрэсар нават не думаў ваяваць супраць Беларусі. Мы будзем мець такія сістэмы праз некалькі месяцаў. Мы не хочам ваяваць і не рыхтуемся да вайны. Але порах трэба трымаць сухім», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што беларуская спецыялісты вывучаюць усе ваенныя канфлікты, якія адбываюцца ў свеце, і на аснове гэтага праходзіць рэфармаванне арміі. «Мы вывучаем усе канфлікты ў свеце і тройчы перафарматавалі сваю армію. Мы вырашылі, што ў нас павінны быць мабільныя, добра ўзброеныя, падрыхтаваныя і выдрэсіраваныя ваенныя часці. Пры неабходнасці яны павінны быць гатовы з'явіцца сёння ў Брэсце, заўтра — у Віцебску. Гэту выснову мы зрабілі, вывучыўшы цяперашнія ваенныя канфлікты», — сказаў ён.

Пры ўсім пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: «Беларусі чужых зямель не трэба. Нам пажадана сваю нікому не аддаць, утрымаць яе. Мы пабудавалі дзяржаву на гэтай зямлі, і трэба, каб гэта зямля засталася нашым дзецям і ўнукам». Гэта будзе самы вялікі падарунак для мяне. Прэзідэнт адзначыў, што у беларусаў склаліся бліскучыя адносіны са смалянамі і тымі людзьмі, якія жывуць на прыгранічны. «Мы дапамагаем адзін аднаму. Беларусы ўбіраюць там хлеб, яны нам плацяць за гэта пастаўкамі паліва. Мяжа паміж дзвюма дзяржавамі не адчуваецца. Што яшчэ трэба? Нам што, галаўны боль яшчэ патрэбны? У нас выдатныя адносіны з гэтымі рэгіёнамі, так будзе і далей», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што трэба быць ідыётам, каб прэтэндаваць на частку зямель такой магутнай дзяржавы, як Расія. «Гэта нерэальна. Трэба супакоіцца і разумець, што гэта быў жарт і не больш. Але калі пасля мяне хто-небудзь з глузду з'едзе, я думаю, беларускі народ не дазволіць яму дзейнічаць такім чынам», — упэўнены беларускі лідар.

«У мяне не ўкладваецца ў галаве, як гэта рускім ваяваць з рускімі? Калі мяне пачынаюць насцярожваць такім чынам або гаварыць аб тым, што пасля Крыма Пуцін прыйдзе ў Беларусь, я наогул уявіць сабе, дапусціць гэтага не магу. Ну як рускі чалавек прыйдзе ў Беларусь ваяваць — родны, на сваю родную зямлю... Трэба супакоіцца, выкінуць усе гэтыя гадасці з галавы. У нас вельмі многа іншых праблем, якія трэба вырашаць», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што некаторыя людзі лічаць беларускую зямлю часткай расійскай тэрыторыі. «Беларусь — гэта суверэнная і незалежная дзяржава. Бываючы тут, ніхто нам не прад'яўляў прэтэнзій. Мы заўсёды былі гасціннымі да любога чалавека, але прымусім любога, хто заяўляе аб тым, што такой дзяржавы раней не было, паважаць нашу суверэнітэт і незалежнасць. Мы свае землі нікому не аддадзім. Гэта мая задача. Якой бы цяжкай яна ні была, я вырашу яе. За маёй спінай стаяць сотні тысяч такіх людзей, узброеных», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## «Майдана» ў краіне не будзе

«Калі ў некага ў галаве ёсць такая шалёная думка, што ў Беларусі магчымы або будзе «майдан», чым раней вы гэта з галавы выкінеце, тым будзе лепш. Ніколі ў Беларусі «майдана» не будзе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на пасадзе Прэзідэнта ў яго дастаткова паўнамоцтваў і сіл, каб прадухіліць братазабойчую бойню. «Нікому — ні вам, ні мне, ні прысутным тут, ні тым, хто нас слухае, — «майдан» не патрэбен. Ёсць асобныя адмарозкі. Але на гэта ёсць і ўлада, каб нейтралізаваць іх і не дапусціць стральбы адзін у аднаго. Ваяваць унутры Беларусі нікому не будзе дазволена», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## На вайне піяр рабіць недапушчальна

Беларусь не імкнецца рабіць піяр на садзейнічанні ў вырашэнні ўкраінскага канфлікту, заявіў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Гавораць, што Беларусь стала нейкім міратворцам. Я пастаянна на гэта адказваю: мы не міратворцы і не напрошваліся на гэту функцыю, нікога не збіраемся мірыць, калі нас аб гэтым не просяць. Мяне папрасілі — зрабіце, што можаце».

«Здарылася гэта бяда, і, вядома, нас гэта хвалявала, і мы абмяркоўвалі гэтыя праблемы — і з Уладзімірам Пуціным, і з Пятром Парашэнкам. Мы не таілі, абмяркоўвалі, можа, не дэталізуючы гэтыя дыялогі. Я ім заўсёды гаварыў і толькі так ставіў пытанне: вы скажыце, і, калі гэта магчыма з нашага боку, мы абавязкова зробім, мы ж не чужыя», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён прадоўжыў: «Гэта вайна не дзесьці там далёка, яна каля нашага парога. Гэта ўплывае ўжо на нас, пачынаючы з таго, што некалькі дзясяткаў тысяч украінскіх бежанцаў на тэрыторыі Беларусі. Нам даводзіцца ратаваць іх — гэта не чужыя людзі. Нам даводзіцца вельмі жорстка закрываць граніцу. Вы правільна заўважылі ў СМІ, што я вельмі часта стаў звяртацца да пагранічнай тэмы і да ваеннай. Я галоўнакамандуючы, я не магу не рэагаваць на некаторыя падзеі ў Іраку, Сірыі. У якім плане? Прыстасоўваючы свае Узброеныя Сілы да сучаснай вайны, робячы высновы. А тут — каля нашага парога вайна. Я вымушаны рэагаваць. І гэта каштуе грошай. Але гэта яшчэ не вайна. Самае галоўнае, каб гэта зараза да нас не прыйшла. На падставе гэтага, хацеў бы — не хацеў, я вымушаны ўмешвацца непублічна ў гэтыя працэсы».

«Калі я спытаў чарговы раз, чым мы, беларусы, можам дапамагчы, дзе мы можам падставіць сваё плячо, — і Прэзідэнт Расіі, і перш за ўсё Прэзідэнт Украіны мяне папрасілі: дапамажыце сабраць людзей, мы хацелі б, каб гэта было ў Мінску. Назва гэтай групы кантактная, дапамажыце правесці, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы зрабілі ўсё, што яны хацелі. Гэта значыць, мы не рваліся ў гэта міратворніцтва. Мы ніякія не міратворцы, нас просяць — мы робім. Будуць нас прасіць яшчэ аб чым-небудзь — мы зробім».

«Што датычыцца нашых ініцыятыў, мы маем свой пункт гледжання па гэтым крызісе і пэўныя прапановы. Пра іх ведаюць Прэзідэнт Расіі і Прэзідэнт Украіны, пра іх ведаюць кіраўнікі ЛНР і ДНР. Падыходзяць яны ім, яны нам скажуць — дапамажыце нам тут і тут. Не — ну што ж, на няма і суду няма. Мы не збіраемся напрошвацца і піярыць на гэтым, як некаторыя гавораць. Такі піяр небяспечны», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

## Шматвектарнасць — галоўны прынцып у знешняй палітыцы

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў існуючай няпростай палітычнай сітуацыі на міжнароднай арэне Беларусь ні на ёту не адышла ад свайго галоўнага прынцыпу ў знешняй палітыцы — шматвектарнасці. «Такую палітыку дыктуе наша геапалітычнае становішча, — нагадаў ён. — На Усходзе жыве наш старэйшы брат, нашы родныя людзі. Там усё пераплецена так, што немагчыма разарваць». Што датычыцца Украіны, то адной з асноўных прычын канфлікту і страты часткі тэрыторыі суседкай з'яўляецца перш за ўсё «бязглуздая нацыяналістычная палітыка». «Але мы гэта не адкідваем — у нас адна гісторыя, мы разам гінулі ў апошняй вайне, нас многае аб'ядноўвае», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца заходніх суседзяў, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з тымі ж Польшчай, Літвой некалі жылі ў адной дзяржаве. «Гісторыя гэта памятае. Куды дзенеш гэту гісторыю?» — сказаў Прэзідэнт. Ён канстатаваў, што сёння Захад з'яўляецца высокатэхналагічным. «З Еўрасаюзам, Амерыкай імкнуцца супрацоўнічаць усе. У тым ліку вельмі хоча гэтага супрацоўніцтва Расійская Федэрацыя, — адзначыў ён. — І, калі намеціўся гэты разлад, вы ўсе бачыце пазіцыю Расіі: яны ўсюды заўсёды заяўляюць, што мы павінны імкнуцца нармалізоўваць адносіны пры ўсіх момантах».

«Ці можна нас папракаць за тое, што мы таксама хочам спакойнага жыцця на Захадзе? — задаўся пытаннем беларускі лідар. — Мы не хочам з імі біцца, скоса глядзець. Можа, проста таму, што яны — нашы суседзі. Нельга іншую палітыку ў адносінах да іх праводзіць. Чаго нам упірацца? У нас адна мэта — каб быў мір і спакой на нашай зямлі. Калі ж мы пачнём бадацца або, не дай бог, ваяваць з нашымі суседзямі, міру ніколі не будзе, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І прыклад гэтага — Украіна». Такім чынам, падвёў вынік кіраўнік дзяржавы, Беларусь правільна вызначыла сваю палітыку як шматвектарную.

Пры гэтым ён адзначыў: краіну не трэба папракаць у тым, што робяць расійскія ўлады. «Мы ніколі не былі здраднікамі. Калі мы бралі на сябе абавязацельствы, мы свята іх выконвалі. У нас шмат агульных абавязацельстваў і абавязацельстваў перад Расіяй, падпісаных дагавораў, заключаных пагадненняў. Я ні на ёту не адышоў ад таго, што абяцаў, я не адышоў ад тых абавязацельстваў, якія ў нас існуюць з Расійскай Федэрацыяй. Але гэта не значыць, што мы, дагаджаючы некаму там (я перакананы, што гэта не кіраўніцтву Расіі трэба, але нават калі б і кіраўніцтву...), будзем ваяваць з Захадам. Каму гэта трэба? Нікому», — рэзюмаваў Прэзідэнт. Разам з тым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Лукашэнка на Захадзе любімым ніколі не будзе».

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб адсутнасці націску на на нашу краіну з боку ЗША. «Я ўсюды кажу: на Лукашэнку немагчыма націснуць. Вы гаворыце, амерыканцы спрабуюць. Ніколі амерыканцы, асабліва ў гэты час, не націскалі на нас: ні ўчора, ні пазаўчора, — падкрэсліў беларускі лідар. — Наадварот, мы вядзём з імі размову, мы дамовіліся: мужыкі, хопіць нам паліваць адзін аднаго граззю ў сродках масавай інфармацыі. Мы гэтага не бачым з боку амерыканцаў. Няма той рыторыкі, якая была. Так, ёсць нейкая інерцыя ў грамадстве — палітзняволеныя, яшчэ нешта... Мы гэта разумеем. Пройдзе. Але ўжо гэтай навалы няма».

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў, што ніякага здрадніцтва, шарахання ў існуючай сітуацыі ад Расіі да Захаду ніколі не будзе. «Расія — святое, — сказаў ён. — На Захадзе я не хачу бачыць ворагаў, і цяпер я іх не бачу. Але гэта не значыць, што я склаў лапкі і сяджу, нечага чакаю. Я кіраўнік дзяржавы, у мяне ёсць паўнамоцтвы — ад пытанняў чалавечага быцця да ваенных, я іх выконваю і буду выконваць дастойна, каб вам не было за мяне сорамна».

## «Вялікі камень» прынясе і вялікія грошы

Рэалізацыя кітайска-беларускага праекта «Індустрыяльны парк «Вялікі камень» можа прынесці мільярдныя даходы, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што неаднаразова наведваў Кітайскую Народную Рэспубліку, у тым ліку яшчэ да свайго прэзідэнцтва. Больш таго, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў звярнуць увагу на кітайскі вопыт яшчэ калі быў дэпутатам парламента, калі выбіралі курс развіцця краіны. Але тады гэта прапанова была жорстка раскрытыкавана.

«І што адбываецца праз больш як 20 гадоў? Кітай — гэта імперыя, гэта другая эканоміка ў свеце, гэта першая краіна па экспарце. Гэта дзяржава, якая сёння фактычна забяспечыла шматпалярнасць у свеце, і гэта вельмі важна, — лічыць Прэзідэнт. — Я заўсёды гаварыў аб тым, што Кітайская Народная Рэспубліка — гэта дружалюбная нам дзяржава. Беларусь ганарыцца сваімі адносінамі з такімі краінамі, як Расія, Кітай, Індыя і іншымі. Гэта нашы сябры, якія заўсёды гатовы падставіць плячо».

Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў беларуска-кітайскія адносіны. У якасці аднаго з пазітыўных прыкладаў ён назваў кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». «Гэта мільярды, у якіх зацікаўлены Кітай, у прыватнасці, у будаўніцтве там суперсучасных прадпрыемстваў, і гэта мільярды даходаў у нашу краіну. Калі мы рэалізуем гэты праект, тады ў нас не будзе праблем ні з залатавалютнымі рэзервамі, ні з падтрыманнем курсу нацыянальнай валюты», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Ён таксама сказаў, што ў бліжэйшы час тэма стварэння парка будзе разглядацца на ўзроўні Прэзідэнта.

Ён падзякаваў кітайскаму боку за дапамогу і падтрымку ў складаны для Беларусі перыяд. Прэзідэнт сказаў, што і папярэдні кіраўнік КНР, і цяперашні Старшыня Кітая Сі Цзіньпін падтрымлівае курс на развіццё сувязяў з Беларуссю. Дарэчы, Кітай выдзеліў Беларусі крэдытаў на суму амаль $15 млрд для рэалізацыі сумесных праграм, прычым пад прымальныя працэнты.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра заяву кітайскага кіраўніцтва, што Кітай не дасць у крыўду Беларусь, будзе яе падтрымліваць. «Я ўдзячны Кітаю за той узровень адносін, які ў нас склаўся», — сказаў Прэзідэнт.

## «У нас няма палітзняволеных»

Прэзідэнт расказаў аб сваім стаўленні да пытання так званых палітзняволеных. «Я мог бы адмахнуцца ад вашага пытання, спаслаўшыся на тое, што ўжо не адзін раз на яго адказваў. Але я гэтага не зраблю. Як чалавек шчыры, адкажу і нават не скажу, што перада мной не ставілі гэта пытанне або што я не маю дачынення да гэтага. Вось што я мог бы так сказаць як палітык. Чую, што на Захадзе гавораць «палітзняволеныя». Я кажу — у нас няма палітзняволеных, таму што ў нас няма палітычнага артыкула ў Крымінальным кодэксе, і гэта сапраўды так», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама адзначыў: «Хочаце вы іх называць палітзняволенымі — называйце. Гэта ўжо прывычна, і гэтаму асаблівай увагі па змесце не надаецца. Ёсць закон, і гэты закон для ўсіх аднолькавы. Я іх не лічу палітычнымі канкурэнтамі для сябе і не лічу цяпер. Самае галоўнае для мяне пры вырашэнні гэтага пытання нават не пытанне напісання просьбы аб памілаванні. Чалавек знаходзіцца ў калоніі, і там ён не адзін. Скажыце: іншыя не хочуць быць на волі? Хочуць. А я чамусьці падпісаў бы ўказ амніставаць аднаго, а чаму не іншых, якія там побач знаходзяцца? Мяне гэта больш за ўсё хвалюе».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для яго галоўнае, як да гэтага паставяцца людзі. Зразумеюць так: Лукашэнка спалохаўся, бачыце, аднаго выпусціць, а іншыя сядзяць. «Зрабіўшы такім чынам, я, магчыма, паўкалоніі павінен амніставаць. А ці маю я на гэта права і, самае галоўнае, падставу? Напэўна, не», — лічыць Прэзідэнт.

Ён сказаў, што ў краіне не дапусціць паўтарэння падзей 19 снежня 2010 года, калі пасля завяршэння галасавання на прэзідэнцкіх выбарах прадстаўнікі апазіцыі зрабілі спробу штурму Дома ўрада.

Паколькі журналіст задаў канкрэтнае пытанне адносна Мікалая Статкевіча, то ў сувязі з гэтым Прэзідэнт сказаў: «Ён для мяне не палітык. У мяне ёсць відэакадры, дзе ён павёў людзей на штурм, ёсць запісы яго каманд, яго перагавораў.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ БЕЗ ЗАКРЫТЫХ ТЭМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-3-й стар.)*

Гэта ж злачынства, і ў любой дзяржаве караецца яшчэ больш строга. Гэта было, таму не трэба гаварыць, што ён палітычны зняволены. Ён учыніў злачынства. Суд прыняў рашэнне на аснове закона. Закон ёсць закон, і яго трэба выконваць. Таму не трэба мяне папракаць, што гэта нейкі палітычны канкурэнт Прэзідэнта».

«Мы ведаем, хто грошы заплаціў, я ведаю, пад што давалі грошы, я ведаю, чаго ад кандыдатаў патрабавалі. Ад іх патрабавалі майдана ў Беларусі — пад гэта грошы дадзім. І я не мог гэтага дапусціць. Таму давайце па-чалавечы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама падкрэсліў: «Калі вы будзеце ламаць дзверы ва ўрадзе, я вас пасаджу. Не ламайце нічога, дзейнічайце ў адпаведнасці з законам, прайдзіце гэты шлях нармальна, цывілізавана. Выйдзіце на галасаванне, я вам гарантую поўную бяспеку, толькі нічога не ламайце і не крышыце. Вось і ўсё, не трэба нікога баяцца».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што вырашэнне пытання так званых палітзняволеных не будзе мець вырашальнага значэння ў нармалізацыі адносін з Захадам. «Я не рвуся ва «Усходняе партнёрства». Бачу, як там вырашаюцца пытанні. Мы вырашым адно пытанне, яны прыдумаюць другое, і яны будуць мачаліць мяне, а можа і ўсіх маіх прыхільнікаў да прэзідэнцкіх выбараў, а потым — паглядзім. І справа тут не ў тым, каб нармалізаваць адносіны з Захадам праз некаторых сядзельцаў. Захад глядзіць значна далей. Ва Украіне гінуць тысячы. І якія паводзіны Захаду?» — задаў пытанне Прэзідэнт.

## Падтрымаць, каго трэба, у сацыяльным плане

У вырашэнні пытання занятасці ў Беларусі ніякага лішняга льгатавання не будзе, заявіў Прэзідэнт Беларусі. Ён адзначыў, што работа над профільным дакументам цяпер праводзіцца і на вышэйшым узроўні да яго вярталіся ўжо двойчы, аднак канчатковы варыянт пакуль не разгледжаны. Пры гэтым Прэзідэнт першапачаткова настойваў на тым, каб усе нюансы былі ўлічаны і падлічаны. «Ніякага лішняга льгатавання не будзе. Мы пастараемся па сярэдзіне прайсці, — падкрэсліў ён, — падтрымаць такім чынам тых, каго трэба падтрымаць, і прымусім працаваць тых, хто павінен працаваць».

«Помню, мяне яшчэ асобныя журналісты крытыкавалі, што Лукашэнка на наркаманах, дармаедах і яшчэ нейкіх катэгорыях у перадвыбарны год спецыяльна піярыцца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Родныя мае, не я ўзняў гэтыя пытанні. У грамадстве гэта праблема бурліць, і я вымушаны рэагаваць на яе».

Прэзідэнт звярнуўся да міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны Шчоткінай з просьбай пракаменціраваць ход падрыхтоўкі праекта дэкрэта і абазначыць яго асноўныя нюансы. Марыяна Шчоткіна адзначыла, што «усе прапановы ўлічаны і дакумент ужо на выхадзе». Паводле яе слоў, першапачатковая неабходнасць яго распрацоўкі была выклікана некалькімі фактарамі. Так, у краіне пасля падвядзення балансу працоўных рэсурсаў высветлілася, што каля 50 тыс. чалавек не бачаць неабходнасці працаваць або проста гэтага не хочуць. Акрамя таго, амаль 200 тыс. чалавек жадаюць працаваць, але, прынамсі, ужо больш за паўгода на работу не ўладкоўваюцца. «Мы чытаем форумы ў інтэрнэце, і людзі пачалі гаварыць аб тым, што па Канстытуцыі ўсе грамадзяне павінны ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў, а не толькі тыя, хто працуе. Відома, працуючыя не хочуць плаціць за тых, хто здае атрыманыя ў спадчыну кватэры і нічога не робіць, і за тых, хто горда гаворыць, што яны фрылансеры, але разам з тым таксама не ўдзельнічаюць у расходах», — адзначыла міністр.

Падчас работы над праектам, паводле яе слоў, зноў жа вывучаліся форумы ў інтэрнэце і прымаліся да ведама заўвагі, якія там выказваліся. Напрыклад, актыўна абмяркоўвалася, якія катэгорыі грамадзян будуць вызвалены ад выплаты аднаразовага збору. Узнікалі прапановы вызваліць ад выплаты збору маці, якія выхоўваюць дзяцей да 7 і нават да 14 гадоў. Аднак было б гэта справядліва на фоне таго, што ёсць таксама шматдзетныя сем'і з малалетнімі дзецьмі, якія, відома, маюць права быць вызваленымі ад выплаты гэтага збору, адзначыла міністр. Пры гэтым, паводле яе слоў, праектам дэкрэта прапануецца абавязаць працаздольных грамадзян, якія на працягу больш як паўгода не выплачвалі падаткі і, адпаведна, не прымалі ўдзелу ў фінансаванні дзяржрасходаў, плаціць аднаразовы збор у памеры 20 базавых велічынь (адна базавая цяпер складае Br180 тыс.). Гэта, напрыклад, датычыцца хатніх гаспадынь (іх налічваецца амаль 123 тыс.), у якіх ёсць забяспечаныя мужы і няма неабходнасці працаваць.

Марыяна Шчоткіна запэўніла, што дакумент будзе прадстаўлены на разгляд Прэзідэнта ва ўстаноўленыя тэрміны.

У той жа час Прэзідэнтам было заяўлена, што пытанне павышэння пенсійнага ўзросту ў Беларусі знята з парадку дня. Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў Беларусі на аднаго пенсіянера прыпадае 1,5 працуючага, а павінна быць мінімум 2–3. «Дык трэба ці не трэба? Трэба. А людзі не хочуць. Ну чаго ж я пайду супраць? Гэта важнае пытанне. Я зняў яго з парадку дня», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што не выключае вяртання Анатоля Тозіка, Мікалая Ладуцькі і Наталлі Пяткевіч на пасады ў дзяржапараце. «Можа, і будуць працаваць у дзяржапараце. Яны пакуль быццам нідзе не працуюць, хоць ім прапаноўваліся розныя варыянты. Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч займаецца гэтым пытаннем. Я яму даручыў. А Наталля Уладзіміраўна (Пяткевіч. — **Заўвага БЕЛТА**), па-мойму, недзе працуе ўжо, не ведаю дзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама растлумачыў, што Наталлі Пяткевіч прапаноўваліся розныя варыянты працаўладкавання, аднак яна пакуль, магчыма, зоймецца сваім здароўем. «Наталля Уладзіміраўна вельмі падрыхтаваны чалавек, якога я ведаю гадоў 20. Што датычыцца Ладуцькі — тое ж самае. Падбяром адпаведныя пасады», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён не выключыў, што гэта могуць быць і недзяржаўныя пасады.

Акрамя таго, адказваючы на пытанне аб матывацыі для чыноўнікаў такога рангу, кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што зарплата — гэта толькі частка таго, што яны атрымліваюць. «У іх ёсць службовы транспарт, у такіх службовых асоб ёсць загарадны дом, дзе яны могуць жыць. З савецкіх часоў такая практыка», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама адзначыў, што Беларусь не можа сабе дазволіць плаціць чыноўнікам такія зарплаты, як, напрыклад, у Расіі. «Мы не можам гэтага. Нас людзі не зразумеюць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## З карупцыяй можна змагацца паспяхова

І міжнародныя эксперты прызнаюць сур'ёзнасць барацьбы з карупцыяй у Беларусі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што нельга сказаць, што ў краіне карупцыю «не спрабавалі выпаліць калёным жалезам». «Нават міжнародныя эксперты, якія да нас ставяцца не вельмі, гэта прызнаюць», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: «Пазбавіцца ад яе ў раз немагчыма. Як чалавек, які займаўся шмат гэтымі пытаннямі, не скажу, што нельга ад яе пазбавіцца, але не скажу, што і можна». Кіраўнік дзяржавы дадаў, што, магчыма, маюць рацыю тыя людзі, якія кажуць, што карупцыю нельга перамагчы, але можна звесці да мінімуму.


Фота БЕЛТА.

Паводле яго слоў, не варта верыць тым, хто сцвярджае, што Прэзідэнт нібыта рэжысіруе барацьбу з карупцыяй. «Калі я рэжысёр, то вы абавязкова павінны знайсці факты маёй карупцыі. Калі я карумпаваны чалавек, то я буду маўчаць, ніколі пра карупцыю не гаварыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт лічыць, што Генпракурор краіны павінен хоць бы раз у квартал інфармаваць СМІ аб фактах карупцыі. «Устанавіць такі парадак, каб Генеральны пракурор, які ў мяне адказвае за кантроль у гэтым плане, адзін раз у квартал інфармаваў журналісцкую супольнасць аб барацьбе з карупцыяй», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, журналісты крыўдзяцца, што часам ад дзяржчыноўніка нельга атрымаць інфармацыю. Прэзідэнт падкрэсліў, што, размаўляючы з журналістамі, чыноўнік праз іх размаўляе з народам.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі ведамасныя інструкцыі перашкаджаюць СМІ атрымліваць ад ведамстваў інфармацыю, то іх трэба «ўстараніць» праз указ або распараджэнне Прэзідэнта. «І наогул трэба выпрацаваць практыку: калі міністр або службовая асоба, да якой звярнуліся, беспадстаўна адмаўляецца размаўляць з журналістамі і адказваць на іх пытанні, — гэта не міністр, не службовая асоба. Звярнуўся журналіст — адкажы. Калі крытыка, у нас, па-мойму, указ ёсць, — павінен адрэагаваць... Гэта не першы раз я ўжо чую аб такім (аб нежаданні размаўляць з масмедыя. — **Заўвага БЕЛТА**)», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## «Бяспека беларускай дзяржавы — кроўны абавязак»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сёння ў час адкрытага дыялогу з журналістамі заявіў, што не мае права самастойна адмовіцца ад прэзідэнцтва, калі па-іншаму не вырашыць народ. Ён таксама адзначыў, што яму было б непрыемна прайграць прэзідэнцкую кампанію, але не баіцца гэтага.

«Я не пайду і пайсці не магу. Не маю права. Я ўжо тлумачыў: калі абрушыцца краіна, а я пайшоў сам, то мяне абвінавацяць у баязлівасці. З мяне спытаюць. І яны будуць мець рацыю», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Я палітык. Я павінен змагацца, як гэта прынята па законах палітыкі. У мяне ёсць нейкі багаж. Мяне цяжка ў нечым абвінаваціць, зачапіць за што-небудзь», — дадаў ён.

«Знімаць сваю кандыдатуру на выбарах або не ісці на выбары я не маю права, калі ў мяне няма на гэта падстаў... Калі я буду жывы і здаровы ў 2015 годзе, вы, магчыма, мяне ўбачыце ў спісах кандыдатаў у прэзідэнты», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Закранаючы асабістыя моманты жыцця, Прэзідэнт паведаміў, што пералічвае палавіну сваёй зарплаты на адкрыты для малодшага сына рахунак, а астатняя захоўвае «ў левай скрыні ўверсе». «Я атрымліваю заработную плату ў беларускіх рублях. Гэта лёгка праверыць. Я напісаў заяву, каб палавіну маёй зарплаты бухгалтэрыя пералічвала на адкрыты ў ашчадным банку спецыяльны рахунак малодшага сына. Як толькі яму споўніцца 18 гадоў, ён зможа атрымаць гэтыя грошы. Астатнія грошы ў канверце захоўваюцца ў кабінеце загараднай рэзідэнцыі ў левай скрыні ўверсе. Я не ведаю, колькі ў мяне там. Ну, можа, Br50 млн у скрыні гэтай ляжыць», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі дадаў, што адзіная валюта, якая можа быць у яго дома, — камандзіровачныя. Яны выдаюцца ў валюце той краіны, куды ён накіроўваецца з рабочай паездкай.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, акрамя таго, малодшы сын збірае грошы на розныя сацыяльныя праекты: будаўніцтва хоспіса і іншыя. «Сумленна скажу, я больш за ўсё не люблю грошы. Яны столькі бед прыносяць. Відома, без іх не абысціся. Але я не вельмі напружаны, куды дзяваць іх. Некаму дапамагу, куплю нешта або пазычу. Купляю падарункі афіцыянту, повару, дворніку на розныя святы. Яны простыя людзі, і іх таксама трэба падтрымліваць», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Свае падарункі беларускі лідар раздае сябрам і знаёмым. «Мне дораць да тысячы падарункаў. Я іх размяркоўваю да адзінага сярод знаёмых і сяброў. Дзяржаўныя падарункі захоўваюцца ў рэзідэнцыі», — дадаў ён.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Уражанні ўдзельнікаў

# АДКРЫТАЯ РАЗМОВА СТАЛА ШЧЫРАЙ

**Іна ФЯКСЕЛЬ, галоўны рэдактар газеты «Навіны Старадарожчыны»:**

— Нас сабралася каля трох соцень у адной зале. Кожны жадаў задаць пытанне і за кожным — вялізная аўдыторыя чытачоў. Усе мы чакаем адказаў і каментарыяў па праблемах, якія нас хвалююць. Гледзячы на ўсё гэта, я падумала, што нас так шмат, а адказвае толькі адзін чалавек. І мне вельмі хацелася б, каб ён бярог сябе. Бо, пажыўшы і папрацаваўшы дастаткова ў журналістыцы, свае надзеі, дабрабыт і мір я звязваю асабіста з тым, хто сёння адказваў на нашы пытанні.

Кожны год падобныя сустрэчы былі цікавымі, змястоўнымі, і заўсёды людзі мелі магчымасць атрымаць адказы на пытанні, якія іх хвалявалі. Але сёлетні фармат больш прываблівы, і хацелася б, каб ён стаў добрай традыцыяй. Мне вельмі спадабалася, як прама і адкрыта Прэзідэнт акрэсліў пытанні, звязаныя з палітычнай сітуацыяй і развіццём Узброеных Сіл. Думаю, гэта хвалюе сёння ўсіх.

**Ірына ПЕТРУСЕВІЧ, галоўны рэдактар газеты «Голас Касцюкоўшчыны»:**

— Я першы раз удзельнічаю ў такім форуме, і мяне ўразіла, што фармат, які абраў Прэзідэнт, — адкрыты дыялог, шчыры дыялог. Уразіла перш за ўсё тое, што сам Аляксандр Рыгоравіч заклікаў журналістаў да смелых, магчыма, не заўсёды камфортных пытанняў. Мы бачым, што Прэзідэнт не баіцца іх і каментуе пытанні любога плана вельмі падрабязна.

Перавага была аддадзена палітычным і эканамічным пытанням, а таксама прысвечаным ЕАЭС. Мне ж запомнілася гутарка пра карупцыю. Сама я гатова была задаць пытанне, але мяне апярэдзіла журналістка з партала tut.by: спытала пра новаўвядзенні ў Закон пра СМІ, якія датычацца інтэрнэту.

**Анастасія ТУРОК, галоўны рэдактар «Аршанскай газеты»:**

— Я ўжо другі раз удзельнічаю ў адкрытым дыялогу з кіраўніком дзяржавы, і заўсёды гэта цікавая, жывая, прадметная гутарка. Сённяшнія пытанні былі разнапланавыя, мне найбольш запомніліся калегі з рэгіянальных СМІ, якія казалі пра тое, з чым яны сутыкаюцца ў сваёй працы. Думаю, усе пытанні, што прагучалі сёння, актуальныя і важныя як для работы журналістаў, так і для краіны ўвогуле.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЭФІР З БЕЛАРУСКІМ АКЦЭНТАМ

## Пазнаёміцца з нашай краінай праз спадарожнікі могуць гледачы ад Канады да Венесуэлы і ад Еўропы да Паўночнай Афрыкі

**Тыя, хто пастаянна жыве на тэрыторыі нашай краіны няшмат ведаюць пра міжнародны спадарожнікавы тэлеканал «Беларусь 24». Між тым менавіта ён шмат у чым фарміруе вобраз Беларусі ў свеце, звязвае нябачнымі нітачкамі далёкія нацыянальныя дыяспары з падзеямі на гістарычнай радзіме і прываблівае патэнцыйных турыстаў расповедамі пра адметныя мясціны, прыродныя багацці і культурную спадчыну сінявокай. 1 лютага тэлеканал адзначыць першую ў сваім жыцці «круглую» дату — 10 гадоў працы. Што найбольш цікавіць замежнікаў у эфіры беларускага тэлебачання, наколькі прырасла аўдыторыя за мінулы час і якія мэты яшчэ толькі плануецца ажыццявіць, абмяркоўваем з дырэктарам «Беларусь 24» Аленай ЛАДУЦЬКАЙ.**



Фота прэс-службы БТРК.

***— 24 гадзіны ў суткі тэлеканал вяшчае для 270 мільёнаў замежных гледачоў у 100 краінах свету... Значныя лічбы!***

— Безумоўна, гэта не значыць, што дакладна ўсе гэтыя людзі сядзяць і кругласутачна без перапынку глядзяць «Беларусь 24», — усміхаецца Алена Ладуцька. — Але ва ўсёй гэтай патэнцыйнай аўдыторыі ёсць такая тэхнічная магчымасць — наш канал знаходзіцца ў адкрытым доступе, і кожны можа, наладзіўшы тэхнічныя параметры (яны змешчаны, напрыклад, у нас на сайце), глядзець тэлеканал. Сёння мы вяшчаем на 4 кантыненты праз 3 спадарожнікі. З іх HotBird A13 лічыцца прэміяльным, ён самы папулярны ў Еўропе, і, дарэчы, з яго дапамогай мы ахопліваем усю Еўропу, плюс паўночныя краіны Афрыкі і некаторыя краіны Азіі. Спадарожнік ABS-2 — наш новы набытак, запушчаны толькі летась 1 мая; да гэтага моманту ў Расіі наш сігнал распаўсюджваўся да Урала, а цяпер у зоне ўпэўненага прыёму Расія цалкам, да Далёкага Усходу, таксама як усе краіны СНД, Прыбалтыка, Каўказ. І, нарэшце, спадарожнік Galaxy 19 дазволіў нам распаўсюдзіць сігнал у Канаду, Амерыку, у тым ліку Паўднёвую — прыкладна да Венесуэлы. Па сутнасці, у зону прыёму не трапляюць хіба Аўстралія і Антарктыда *(усміхаецца)*. Гэта што тычыцца свабоднага распаўсюджвання. А яшчэ нас «бяруць» розныя кабельныя аператары.

***— Прычым, здаецца, «бяруць» даволі ахвотна — кажуць, за мінулы год абаненцкая база «Беларусь 24» прырасла на 20%?***

— Так, гэта тая аўдыторыя, якую мы можам падлічыць. Найбольш актыўна нас глядзяць у Расіі. Па выніках спецыяльна праведзенага даследавання наогул магу сказаць, што ў параўнанні з 2013 годам глядзельнасць павялічылася больш чым удвая — у канкрэтных лічбах гэта значыць, што ў 2013-м нас паглядзелі больш як 10 мільёнаў чалавек, а ў 2014-м ужо больш як 20 мільёнаў хоць бы раз уключалі «Беларусь 24».

***— Ці залежыць гэтая актыўнасць ад колькасці этнічных беларусаў, якія пражываюць на пэўнай тэрыторыі?***

— На мой погляд, цікавасць да канала дастаткова раўнамерная ў розных рэгіёнах. Проста там, дзе ёсць этнічныя беларусы, нам прасцей працаваць. Напрыклад, у Цюмені знаходзіцца вельмі моцная беларуская дыяспара, каля 50 тысяч чалавек, дый ганаровы консул Беларусі Уладзімір Шугля адчувальна садзейнічае ў перамовах з кабельнымі аператарамі, займаецца папулярызацыяй тэлеканала. Праўда, часам складана адсачыць, дзе нас ужо ведаюць: бывае, кабельныя аператары ўключаюць «Беларусь 24», не ставячы нас у вядомасць. Такая гісторыя здарылася, напрыклад, у рэспубліцы Комі, дзе беларуская нацыянальная культурная аўтаномія, аказваецца, даўно ўжо глядзіць беларускія навіны. Таксама атрымалі адказ з беларускага пасольства ў Фінляндыі, што наш канал ужо ўключаны ў самы папулярны сярод рускамоўнага насельніцтва пакет «Карціна ТБ». Насамрэч мы нічога не маем супраць гэтага, толькі рады, але заключэнне дагавораў усё ж таксама важнае хаця б з пункту гледжання ўліку ахопленай аўдыторыі.

**Бывае, кабельныя аператары ўключаюць «Беларусь 24», не ставячы нас у вядомасць. Такая гісторыя здарылася, напрыклад, у рэспубліцы Комі, дзе беларуская нацыянальная культурная аўтаномія, аказваецца, даўно ўжо глядзіць беларускія навіны.**

***— 10 гадоў таму, калі тэлеканал толькі запускаўся, стаўку рабілі на зборны кантэнт — лепшыя праграмы ўсіх айчынных каналаў. Якім чынам абіраюцца гэтыя праграмы і «выціскаецца самы сок»?***

— Перадусім, вядома, мы адсочваем і выкарыстоўваем самыя папулярныя праграмы з тэлеканалаў холдынга Белтэлерадыёкампаніі — «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3» — штотыднёва атрымліваем рэйтынгі і выбіраем для размяшчэння на сваім канале найбольш запатрабаваныя тэлепраекты. Таксама ў кампіляцыю лепшых праектаў уваходзяць праграмы АНТ і СТБ, у першую чаргу забаўляльныя (канцэрты «Песня года Беларусі», шоу «На тым жа месцы ў той жа час» і г.д.), за што мы калегам вельмі ўдзячны, бо гэтая прадукцыя прапаноўваецца бязвыплатна. Акрамя таго, безумоўна, пастаянна пашыраем вытворчасць уласных праграм, сярод якіх інфармацыйна-аналітычныя, пазнавальныя. На сёння іх 10, неўзабаве будзе больш.

***— Гэта якраз тыя праграмы, пра якія беларусы ў Беларусі мала ведаюць...***

— Напрыклад, праект **«90 секунд»** цяпер ідзе не толькі на «Беларусь 24», але і на першай «кнопцы». Гэты насычаны і сціслы блок навін — наша ўласнае адкрыццё, у чымсьці ён пераклікаецца з падачай Euronews, дый наогул такі кароткі фармат вельмі запатрабаваны ў сучасных гледачоў. Па суботах у нас выходзіць выніковая праграма **«Беларусь 24. Падзеі тыдня»** — агляд падзей, якія адбыліся ў палітычным, эканамічным, культурным жыцці краіны за апошнія 7 дзён. З лютага запускаем некалькі новых праектаў: праграма **«Акцэнты»** — кароткі аналітычны вынік дня, разгляд асноўнай падзеі, якая адбылася ў гэты дзень, з розных пунктаў гледжання; **«АРТ-і-ШОК»** — калісьці гэта праграма пра таленавітых людзей, арыгінальных творчых ідэі і незвычайныя перформансы ўжо выходзіла на нашым канале і карысталася вялікай папулярнасцю, а цяпер, пасля паўзы і істотнага рэбрэндынгу, яна стане больш дынамічнай і сучаснай і будзе выходзіць двойчы на месяц; праект **«Звычайны дзень»** — здымачная група праводзіць цэлы працоўны дзень з прадстаўніком пэўнай прафесіі (гэта можа быць і міністр, і настаўнік, і бізнесмен, і святар) і распавядзе пра падрабязнасці гэтых будняў, магчыма, зусім не вядомыя шырокай аўдыторыі. Праект «Мытны саюз» таксама пасля рэбрэндынгу будзе выходзіць пад назвай **«Без межаў»** і знаёміць гледачоў з навінамі Еўразійскага эканамічнага саюза... Калісьці, калі тэлеканал толькі ствараўся, гэта было даручэнне Прэзідэнта — быць не толькі агрэгатарам чужых ідэй, але і рабіць уласныя праграмы. Сёння, напэўна, ужо можна сказаць, што гэтае даручэнне выканана, тым больш мы пастаянна ўдасканальваемся, абнаўляемся і развіваемся ў гэтым кірунку.







***— Ведаю, што паміж тэлеканалам і гледачамі наладжана цесная зваротная сувязь, у тым ліку праз сацыяльныя сеткі. Пра што пішуць замежнікі, што глядзяць з найбольшым задавальненнем, а чаго, наадварот, не хапае?***

— Канал «Беларусь 24» зроблены па прынцыпах класічнага разнажанравага тэлебачання: аснова — гэта навіны, якія дапаўняюць кінапаказ, забаўляльныя, пазнавальныя і іншыя праекты. Паводле водгукаў, найперш навіны і інфармацыйна-аналітычныя праграмы цікавяць большасць гледачоў. Далей ідуць забаўляльныя праекты і кінапаказ. У сферы пазнавальных праграм значна большая канкурэнцыя, попыт надзвычай вялікі, і трэба пастарацца, каб прыцягнуць увагу аўдыторыі — але мы імкнёмся гэта рабіць.

**Таксама стараемся, каб заставацца запатрабаванымі, быць сучаснымі, таму ў бліжэйшай перспектыве — развіццё ў мабільных сістэмах, выкарыстанне сэрвісаў IPTV, OTT, дзякуючы якім тэлеканал можна глядзець наўпрост па мабільным тэлефоне.**

Таксама стараемся, каб заставацца запатрабаванымі, быць сучаснымі, таму ў бліжэйшай перспектыве — развіццё ў мабільных сістэмах, выкарыстанне сэрвісаў IPTV, OTT, дзякуючы якім тэлеканал можна глядзець наўпрост па мабільным тэлефоне. Мы, спадзяюся, не адстанем ад гэтага трэнда, бо, як сцвярджаюць усе мае калегі, за ім будучыня.

І, безумоўна, будзем захоўваць шчыльную зваротную сувязь з аўдыторыяй. Дарэчы, аналізуючы актыўнасць наведвання сайта belarus24.by, мы бачым, што колькасць наведнікаў пастаянна расце — гэта, безумоўна, прыемна, як і рост падпісчыкаў у сацыяльных сетках. Што дзіўна, найвялікшую цікавасць да сайта праяўляюць самі грамадзяне Беларусі, таксама актыўныя карыстальнікі — з Расіі і Украіны. Мы адсочваем усе заўвагі і прапановы, якія прыходзяць праз сайт, праз электронную пошту, сацсеткі, і стараемся своечасова рэагаваць на іх.

Дырэктар «Беларусь 24» не без гонару заўважае, што замежныя гледачы не крытыкуюць, а дзякуюць тэлеканалу за якасную «карцінку», за цікавую, змястоўную і разнабаковую падачу інфармацыі. «Самыя строгія і прыдзірлівыя нашы крытыкі — мы самі. Трэба ўвесь час рухацца, быць сучаснымі, дынамічнымі і яркімі, інакш спынішся ў развіцці», — дадае Алена Ладуцька. Таму, віншуючы тэлеканал з першай «дзясяткай», «Звязда» зычыць калегам-тэлевізійнікам якраз гэтага — развіцця і ўдасканальвання. І, безумоўна, новых удзячных гледачоў!

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК**



## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Цяжкія думкі наведваюць вас што ні дзень. У пачатку тыдня будзеце знаходзіцца ў прыгнечаным стане, але варта прыняць сітуацыю такой, як яна ёсць, і перастаць хваляваць пра тое, што было ў мінулым, бо гэта ўжо прайшло. Для вас надыходзіць новы перыяд, адкрываюцца новыя магчымасці, цёмная паласа мінае. На працягу тыдня сітуацыя супакоіцца і з'явіцца выразная тэндэнцыя для развіцця, аднаўлення і руху наперад. Усё наладзіцца, і справы пойдуць угору.

**СКАРПІЁН.** Не шукайце кантактаў і сустрэч, бо не час для наладжвання ні сяброўскіх, ні раманнтычных сувязяў. Варта сканцэнтравацца на сабе, на сваіх унутраных патрэбах. Займіцеся самавывучэннем, медытацыяй. Тыдзень плённы для таго, каб адкрыць унутраныя сілы, прыдумаць нешта новае, для творчых парываў і новых ідэй. Усё гэта зыходзіць з вас, і якія-небудзь іншыя людзі тут залішнія. Таму ўсе сацыяльныя справы будуць альбо слаба рухацца, альбо зусім адсутнічаць.

**СТРАЛЕЦ.** Лепш за ўсё будзе складвацца асабістае жыццё, асабліва стасункі з сям'ёй і блізкімі сваякамі. Спакойная плынь часу дазволіць вырашыць любыя спрэчныя моманты, якія маглі быць у вас да гэтага, і наладзіць свае адносіны. Гэтак жа добра ідуць справы ва ўсім, што звязана з домам: рамонт або набыццё якіх-небудзь рэчаў. Не варта спяшацца — усё павінна ісці сваёй чаргой, тады вы зможаце разлічваць і на спакой, і на пэўную долю поспеху. Спрыяльны перыяд для таго, каб штосьці ствараць сваімі рукамі.

**КАЗЯРОГ.** Вашы адносіны чакаюць выпрабаванні. Магчыма расчараванне ў сваім партнёры, у ладзе жыцця, што прывядзе да жадання разысціся, узяць перапынак і адпачыць адно ад аднаго. У многіх гэта праява ўласнай слабасці і нежаданне штосьці-небудзь рабіць. Сапраўды, вам можа спатрэбіцца час на асэнсаванне, але гэта павінна суправаджацца актыўнымі дзеяннямі, прыняццем рашэнняў. Не павінна быць адкладвання на доўгі час. Калі вы праявіце сябе належным чынам, то да канца тыдня адносіны пойдуць на папраўку, у іх з'явіцца новая мэта і крыніца сіл.

**ВАДАЛЕЙ.** У пачатку тыдня нагадаюць пра сябе старыя справы, якія ў свой час не былі давядзены да канца. Зрэшты, у гэтым ёсць і добры бок, бо, вырашаючы нейкія даўнія праблемы, вы можаце атрымаць з іх выгаду: як у форме вопыту, так і канкрэтную, матэрыяльную. Гэта ж паслужыць падставай для наладжвання новых карысных знаёмстваў і сувязяў. У цэлым для ўсяго, што звязана з фінансамі і навядзеннем парадку тыдзень спрыяльны. Другая яго палова добрая таксама і для асабістага жыцця, дзе вы будзеце адчуваць сябе камфортна і ўпэўнена.

**РЫБЫ.** Нечаканае паведамленне можа паступіць да вас у пачатку тыдня, што сур'ёзна зменіць вашы планы. Вам варта адразу ж адрэагаваць на гэтае здарэнне (падзея можа быць і даволі прыемнай), каб перавесці яго ў патрэбнае для сябе рэчышча. Першая палова тыдня абяцае быць ажыўленай. Праяўляйце ініцыятыву — гэта паслужыць вам на карысць. Не выключаны паездкі і вялікая колькасць кантактаў, зносін на працягу тыдня. Бліжэй да выхадных сітуацыя будзе развівацца больш спакойна ў патрэбным вам напрамку.

## ЧАЦВЕР, 5 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Адвакатэсы».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.40 Серыял «Сваты 6».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.30** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Баявік «Кулінар».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.50, 21.35 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**12.50** «Сустрэча з...» Тамара Ганчарова.
**13.25** Кіпень.
**13.45, 18.50 Серыял «Інтэрны».**
**14.50, 19.50 Серыял «Фізрук».**
**15.50** «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
**16.35** Хачу ў тэлевізар!
**17.50, 0.15 Серыял «Каханне на раёне».**
**20.50** Рэальны свет.
**21.25** Спортлато 6 з 49.
**21.30** КЕНО.
**23.25 Фэнтэзі «Усемагутныя Джонсаны».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 17.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**8.55 «Вандроўнік». Прыгодніцкі фільм.**
**10.30, 18.20** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**10.55** «Размаўляем па-беларуску».
**11.00 «Выхаванне жорсткасці ў жанчын і сабак». Драма.**
**13.20, 23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стальмашонка.
**13.45** «Сустрэчы ў Букваедзе». Пісьменнік-фантаст Нік Пірумаў.
**14.35** І. Бергман. «Сунічная паляна». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.
**16.30** «Наперад у мінулае».
**17.00 «Гваздзік». Драма.**
**18.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.20 «Сірано дэ Бержарак». Меладрама.**
**20.45** Калыханка.
**21.00, 22.35 «Кафедра». Драма.**
**22.10** «Дыя@блог». «Пра вечнае».

### БЕЛАРУСЬ 5

**4.05, 12.05, 20.00** Баскетбол. НБА. «Х'юстан» — «Чыкага».
**6.15, 0.15** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Спартыўныя танцы. Адвольная праграма.
**10.35** Гандбол. SEHA-ліга. «Вардар» (Македонія) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
**13.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Жанчыны.
**14.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Мужчыны.
**15.50** Гандбол. Чэмпіянат свету. Фінал.
**17.20** Авертайм.
**17.50** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Матч за 3-е месца. Славакія — Швецыя.
**21.45** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Фінал. Расія — Канада.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Аднакласнікі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Тэст на цяжарнасць».**
**23.10 Серыял «Адналюбы».**
**0.10** «Вячэрні Ургант».
**0.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.55** «Глядзець усім!».
**9.15** «Прыгоды дылетанта».
**9.45** «Гарачы лёд».
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.50 Баявік «Пад прыцэлам».**
**15.30** «Ежа багоў».
**16.50** «Далёкія сваякі».
**18.30** «Нам і не снілася»: «Вялікая тайна вады».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Драма «Дарыян Грэй».**
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Тайны свету».
**23.55** «Аўтапанарама».
**0.15 «Халасцякі». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Як справы?».
**9.30, 1.30 Маст. фільм «Дама з папугаем».**
**11.20 Маст. фільм «Галоўнае — паспець».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 4.10 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 3.15** Дак. серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
**16.25** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Шалёны анёл».**
**19.25 Маст. фільм «Выкапнёвы».**
**21.10, 23.15 Серыял «Адплата».**
**0.35** «Культпрасвет».
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**11.50** «Покер 45. Сталін, Чэрчыль, Рузвельт». Фільм 1-ы.
**12.50 Серыял «Каменская».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.55** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае».
Ток-шоу.
**15.40** «Пятая графа. Эміграцыя».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.00 Серыял «Варажба пры свечках».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.55** «Прамы эфір».
**22.15 Серыял «Даруй мне, мама».**
**0.05** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Справа ўрачоў».
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45, 22.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45, 23.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**22.45** «Анатомія дня».
**0.25 Серыял «Пятніцкі».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.35, 19.50, 20.55, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.55 Серыял «Краса нацыі».**
**8.15, 18.30 Серыял «Барвовае поле».**
**9.15** «Кінабланкнот».
**9.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**10.30** «МакаShow».
**11.00 Драма «Дом духаў».**
**13.35 Серыял «Чарцяня».**
**15.15** «Хатняя крама».
**16.30** «Золата маўчання». Эл. Ст. Джон.
**17.00 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме».**
**19.35** «Фэшн is my прафэшн».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Трылер «Пагоня».**
**23.00 Серыял «Прыгарад».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 20.00** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**10.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня».
**12.00** Меладрама «Уімблдон».
**14.05, 23.15, 2.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00, 1.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00, 3.00** «Маё вяселле лепшае!».
**21.10** Камедыя «Агент 117: Місія ў Рыа».
**0.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.15** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.05, 2.50** «Навоі». Дак. фільм.
**12.10, 20.10** «Правілы жыцця».
**12.40** Расія, любоў мая!
**13.05, 22.15** «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
**13.30, 22.45** Сустрэча на вяршыні. «Гульні розуму з Тацццянай Чарнігаўскай».
**14.05, 1.55** «Пецярбургскія тайны». Серыял.
**15.10** «А. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
**15.40** «Абсалютны слых».
**16.20** «Больш, чым каханне». Уладзімір і Наталля Вярнадскія.
**17.05, 1.10** Рахманінаў. Выбранае. Канцэрт № 2.
**17.40** «Алгарытм Берга». Дак. фільм.
**18.10** «Паліглот». Партугальская з нуля за 16 гадзін! № 16.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** «Апошні імператар. Дуэль з лёсам». Дак. фільм.
**21.30** «Культурная рэвалюцыя».
**23.35** «Сям'я Ман. Стагадовы раман». Маст. фільм.
**1.45** «Pro memoria». «Капелюшы і капялюшыкі».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** Дак. фільм «Канстанцін Сіманаў».
**7.00** «Праграма «А». 1989 год. 2-я частка.
**7.50, 1.20** «Мільянерка». Фільм-спектакль. 1974 год.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 5.00** «Песня-86». 2-я частка.
**13.00** «Маскоўскія матывы». Фільм-канцэрт. 1981 год.
**13.30, 19.30** Тэлеспектакль «Узнагарода — тысяча франкаў». 1983 год.
**14.40, 5.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**17.00** «Гэтыя неверагодныя музыканты». 1977 год.
**18.00** «Клуб падарожнікаў». «Па запаведных месцах Данбаса».
**19.10** Фільм-канцэрт «Вакальна-інструментальны ансамбль «Ялла». 1978 год.
**20.25** «Часы не выбіраюць». Фільм-канцэрт з удзелам Тацццяны і Сяргея Нікіціных. 1988 год.
**23.00** Праграма «ТЭМА» з У. Лісцьевым: «Жанчыны і армія». 1992 год.
**0.00** «Да 16 і старэйшым». 1989 год.
**0.50** «Рытм, рытм, рытм». Фільм-канцэрт. 1979 год.

### EUROSPORT

**10.30** Тэніс. «Матс пойнт».
**11.00, 15.00, 21.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**11.45, 16.00** Горныя лыжы.
**12.00** Горныя лыжы. Універсіада.
**13.00, 17.00, 0.00** Снукер. Прафесійны снукерны турнір.
**16.15, 21.45, 1.00, 2.00** Футбол. Кубак афрыканскіх нацый.
**20.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Жанчыны.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 16.15, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Шчырая размова».
**8.25** Камедыя «Законы прывабнасці».
**10.35** Камедыя «Дыска».
**12.15** Камедыя «Блізнюк».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.15, 16.00, 17.10, 20.00, 22.50, 0.50, 2.50** Скетчком «Паміж намі».
**18.20** Камедыя «Спатканне».
**20.20** Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
**21.45, 22.40** «Камедыянты. Лепшае».
**23.10** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».



**1.15** Камедыя «Банда няўдачнікаў».
**4.00** Камедыя «Жаніх напракат».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар І...».
**8.05, 18.50, 1.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**9.45, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.30** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.25, 16.25** «Шчырая размова».
**13.20** «Аўрора». Серыял.
**14.40, 0.15** «Каменская». Серыял.
**15.30, 22.35, 3.15** «Зорныя гісторыі».
**17.20, 4.00** «Простыя складанасці».
**20.40** «Ганна Герман». Серыял.
**21.40, 0.55** «Скрыня Пандоры». Серыял. Заключная серыя.
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.30** Камедыя «Добры хлопец».
**8.10** Меладрама «Палюбоўнікі».
**10.10** Трылер «Чырвоны дракон».
**12.25** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
**14.05** Фэнтэзі «Гары Потэр і вязень Азкабана».
**16.35** Баявік «Галівудскія копы».
**18.30** Драма «Заганныя сувязі».
**20.00, 4.30** Трылер «8 міліметраў».
**22.00** Драма «Дарыян Грэй».
**23.55** Фэнтэзі «Гары Потэр і Кубак Агню».
**2.35** Драма «Рэйчал выходзіць замуж».

### ТБ1000

**6.20** Казка «Агонь, вада і... медныя трубы».
**7.50** Казка «Кароль-алень».
**9.10** Меладрама «Будзь са мной».
**10.30** М/ф «Карлік Нос».
**12.00** Драма «Салодкая жанчына».
**13.40** Трылер «Цёмны свет».
**15.30, 4.50** Камедыя «Свята пад замком».
**17.00** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**18.40** Драма «Гульні матылькоў».
**20.20** Баявік «22 хвіліны».
**21.50** Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
**23.30** Камедыя «Хлопец з Марса».
**1.20** Баявік «Брыгада: Наследнік».
**3.10** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.43, 12.41, 18.44, 22.56, 2.42** Зрабі або памры.
**7.28, 13.27, 19.09, 22.31, 2.17** Навуковыя недарэчнасці.
**7.53, 8.57, 13.52, 5.40** Кіраванне натоўпам.
**8.13** Папулярная навука.
**9.42, 11.11, 14.12, 19.29** Машыны: разабраць і прадаць.
**10.27, 14.57, 20.15** Шаша праз пекла.
**11.56** Золата Юкана.
**15.43** Як змей марскі.
**16.28** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**17.13** Ракавая стыхія.
**17.59, 3.02** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**21.00, 0.47, 3.46** Экстрэмальнае падарожжа.
**21.45, 1.32, 4.30** Экстрэмальныя даследчыкі.
**23.16** Турэмныя цяжкасці.
**0.01** Паранармальнае.
**5.15** Гульні розуму.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.40, 13.50** Курс экстрэмальнага ваджэння.
**12.10** Майстры патаргавацца.
**13.00, 7.05** Рачныя монстры.
**14.40** Залатая ліхаманка.
**23.50** Брысталькі заліў.
**0.40, 3.35** Гульні ў ламбардзе.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**4.25** Што ў вас у гаражы?
**5.15** Махінатары віртаюцца.
**6.05** Навука магіі.

## СУБОТА, 7 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.50** Існасць.
**7.20 Меладрама «Бедная Liz».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.45** Кулінарная дыпламатыя.
**10.20, 23.45 Серыял «Трохі не ў сабе». 1-я серыя.**
**11.25** «Пра ежу!».
**12.10** Гісторыі рамонту.
**12.50** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.30** БеларусьLIFE.
**13.55** «Зорнае жыццё». «Асуджаныя на адзіноту».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Трыумф. Героям спорту 2014». Дзённік.
**15.50 Меладрама «Каханне як няшчасны выпадак».**
**19.15, 21.40** «Я магу!» Народнае шоу. Паўфінал.
**21.00** Панарама.
**22.00 Меладрама «Бацька паняволі».**
**0.50** Дзень спорту.
**1.00 Меладрама «Жыло-было каханне».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05 Фільм-казка «Агонь, вада і... медныя трубы».**
**8.25** Толькі для дарослых.
**8.45** М/с «Аватар. Легенда пра Аанга».
**9.40** Беларуская кухня.
**10.15, 21.10** Тэлебарометр.
**10.20** Анімацыйны фільм «Ледніковы перыяд 4: Кантынентальны дрэйф».
**11.55** Капейка ў капейку.
**12.30** «Экстрасэнсы вядуць расследаванне».
**13.40** Вось гэта дзіва!
**14.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Спрынт. Жанчыны.
**15.55** «Comedy woman».
**16.50** Ікра.
**17.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Спрынт. Мужчыны.
**19.15** Ваша лато.
**19.40** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.55** «Разбуральнікі міфаў».
**21.00** Спортлато 6 з 49.
**21.05** КЕНО.
**21.30 Камедыя «Кабельшчык».**
**23.15 Камедыя «Нацыянальная бяспека».**
**0.50** «Сустрэча з...» Зоя Луцэвіч.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00 «Старажытнае паданне. Калі сонца было богам». Драма.**
**10.15** «Камертон». Протаіерэй, кампазітар Андрэй Бандарэнка.
**10.40 «Маладая гвардыя». Драма.**
**13.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.55 «Шасцёра вандруюць па свеце». Фільм-казка.**
**15.00** «Шчасце берагчы». Андрэй Макаёнак.
**15.30** «Цуды прыроды». Чэхія. Куба. Фіджы.
**16.00** «Навукаманія». Ствалавыя клеткі.
**16.25** «Зімовыя мроі». Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.
**17.25** «Дыя@блог P.S.».
**17.50 «Скарлет». Меладрама.**
**20.45** Калыханка.
**21.05 «Сабор Парыжскай Багародзіцы». Драма.**



**23.00** «Уяўны Парыж». Французскія мастакі — выхадцы з Беларусі.

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.35, 9.50** Баскетбол. НБА. «Сан-Антоніа» — «Маямі».
**7.45, 2.55** PRO спорт. Навіны.
**8.15** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Супермікс.
**11.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Змешаная эстафета.
**13.10** Чэмпіянат свету па кікбоксінгу.
**15.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Арсенал».
**17.30** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Югра» (Ханты-Мансійск).
**19.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**20.55** Гандбол. SEHA-ліга. «Раднічкі» — «БГК імя Мяшкова».
**22.35** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «ВЭФ» — «Цмокі-Мінск».
**0.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Ліверпуль».
**2.05** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Сямён Фарада. Уно моменто!».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** «Бацькоў у школу!».
**13.45 Камедыя «Гарфілд».**
**15.15** «Рассмяшы коміка».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «100 мільёнаў».
**18.15 Драма «Географ глобус прапіў».**
**21.05** «Роза Хутар». Канцэрт.
**23.00** «Легенды Life. «Queen».
**23.45 Баявік «Механік».**

### СТБ

**5.40 Камедыя «Агент па мянушцы Спот».**
**7.20** «Анфас».
**7.35** «Тайны свету».
**8.30** «Прыгоды дылетанта».
**9.00** «Разумней не прыдумаеш». «Сезон адкрыццяў».
**10.00** «Іншая краіна». «Аб'яднаныя Арабскія Эміраты: не нафтай адзінай».
**10.40** «Дарагая перадача».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35, 23.10 Маст. фільм «Белы Бім Чорнае Вуха». 1-я серыя.**
**13.20** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Нам і не снілася»: «Вялікая тайна вады».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.15** «На тым жа месцы ў той жа час».
**20.00** «СТБ спорт».
**20.10 Баявік «Васабі».**



**22.00** «Зорны рынг».
**0.45** «Глядзець усім!».

### МІР

**6.00, 5.30** М/ф.
**8.10** «Саюзнікі».
**8.40** «Сабака ў доме».
**9.05** «Скажыце, чаму?».
**9.30** «Ой, мамачкі!».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «Кітайскі сервіз».**
**12.35 Маст. фільм «Белая графіня».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.10 Серыял «Амазонкі».**
**21.50 Маст. фільм «Новы хлопец маёй мамы».**
**23.40 Серыял «Лялькаводы».**
**3.40 Маст. фільм «Светлы шлях».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Дуэль з вірусам. Выратаваць чалавецтва».
**7.50** «Планета сабак».
**8.20, 11.15 Маст. фільм «Кропля святла».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.45** «Суботнік».
**12.20 Маст. фільм «Марная ахвяра».**
**14.15 Маст. фільм «Кар'ера Дзімы Горына».**
**16.05** «Пакой смеху».
**17.10** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45 Маст. фільм «Мой белы і пушысты».**
**22.35 Маст. фільм «Вецер у твар».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.10 Серыял «Гончыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Груз».**
**8.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**11.05** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25 Серыял «Дазнаўца».**
**16.00 Дэтэктыў «Падазрэнне».**
**17.40** «Выратавальнікі».
**18.05** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.10 Маст. фільм «Воўчы востраў».**
**0.50** «Мужчынская годнасць».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 15.15, 19.10, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.30 Серыял «Барвовае поле».**
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.40 Прыгоды «У пустыні і ў джунглях», 1-я серыя.**
**13.20 Драма «Пералом».**
**15.20** «Кінаблакнот».
**15.30** «Тэлемагазін».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Маст. фільм «Індзіяна Джонс. Храм лёсу».**
**18.25 Серыял «Месца злачынства Маямі».**
**19.15 Трылер «Дракула».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Вестэрн «Джанга».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хатняя кухня».
**12.30** Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
**15.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.30** Камедыя «Як выйсці замуж за мільярдэра».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Супер Макс».
**20.30** Прыгоды «Даспехі Бога 3: Місія Задыяк».
**23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** Скетч-шоу «Валера-ТБ».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** «Людзі ХЭ».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Мой ласкавы і пяшчотны звер». Маст. фільм.
**12.20** «Эміль Лацяну». Дак. фільм.
**13.00** Вялікая сям'я. Аляксандр Гарадніцкі.
**13.55** Пернікавы домік. «Узорныя вокны».
**14.25** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
**14.50** «Шаляпін-гала. Казань — Санкт-Пецярбург». Канцэрт у Татарскім акадэмічным дзяржаўным тэатры оперы і балета імя М. Джаліля.
**16.45, 1.55** «Вяселле ў Занскары». Дак. фільм.
**17.45** «Планета Папанава». Дак. фільм.
**18.25** «Наш дом». Маст. фільм.
**20.00** «Рамантыка рамансa». Спяваюць акцёры тэатра і кіно.
**20.50** Кіно на ўсе часы. «Электрычны вершнік». Маст. фільм.
**22.55** Лія Ахеджакава, Альберт Філозаў у спектаклі Тэатра нацый «CIRCO AMBULANTE».
**1.00** «Зязюлін сад». Дак. фільм.
**2.50** «Леся Украінка». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Клуб падарожнікаў». «Па запаведных месцах Данбаса».
**7.10** Фільм-канцэрт «Вакальна-інструментальны ансамбль «Ялла». 1978 год.
**7.30, 1.30** Тэлеспектакль «Узнагарода — тысяча франкаў». 1983 год.
**8.25** «Часы не выбіраюць». Фільм-канцэрт з удзелам Тацціяны і Сяргея Нікіціных. 1988 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** Праграма «ТЭМА» з У. Лісцьевым: «Жанчыны і армія». 1992 год.
**12.00, 18.00** Творчы вечар паэта М. Рабініна. 1991 год.
**12.50, 2.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**13.15** «Тэмп». Музычная праграма. 1992 год.
**13.50** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».



**16.00** «Колба часу».
**17.00** Праграма «Погляд». 2-я частка. 1988 год.
**19.00** «Ранішняя пошта». 1985 год.
**19.35** «Вакол смеху». 1984 год.
**21.00** «Спявае Аляксандр Сярой». 1988 год.
**21.35** Дак. фільм «Нядзельныя дзеці».
**22.00** Маст. фільм «Даруй нам, сад». 1-я серыя.
**23.10** «Шэсць песень на біс». 1993 год.
**0.00** Дак. фільм «Канстанцін Сіманаў». 2-я серыя.
**1.00** «Маскоўскія матывы». Фільм-канцэрт. 1981 год.
**5.00** «Гэтыя неверагодныя музыканты». 1977 год.

### EUROSPORT

**3.15, 2.00** Ралі. ERC.
**10.30, 13.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**11.45, 17.00** Горныя лыжы.
**12.00, 15.45** Горныя лыжы. Універсіяда.
**13.30, 17.15** Біятлон. Кубак свету.
**18.45, 2.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**20.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**22.45** Снукер. Прафесійны снукерны турнір.
**1.00** Конны спорт. Кубак свету.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 16.15, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Блізнюк».
**8.30** Камедыя «Спатканне».
**10.45** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**12.30** Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.15, 16.00, 16.55, 20.00, 22.50, 0.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**18.10** Камедыя «Востраў Нім».
**20.20** Камедыя «Зорка сцэны».
**21.45, 22.40** «Камедыянты. Лепшае».
**23.10** Меладрама «Мой лепшы палюбоўнік».
**1.15** Меладрама «Звычка жаніцца».
**4.00** Камедыя «Дыска».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.15, 5.10** «Свая праўда».
**11.15** «Хронікі маскоўскага быту».
**12.00** «Гісторыі выратавання».
**12.30** «Агент». Серыял.
**19.00, 1.45** Маст. фільм «Біццё сэрца».
**22.20** Маст. фільм «Вайна Багоў: Бессмяротныя».
**0.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.45** «Водар жанчыны».

### ТБ1000

**6.30** Камедыя «Хлопчыкам гэта падабаецца».
**8.15** Фантастыка «Паралельныя светы».
**10.15** Камедыя «Добры хлопец».
**12.00** Драма «Дарыян Грэй».
**14.00** Фэнтэзі «Гары Потэр і ордэн Фенікса».



**16.30** Драма «Заганныя сувязі».
**18.00** Трылер «Ілюзія падману».
**20.00** Камедыя «Імоджэн».
**21.45** Драма «Лінкальн для адваката».
**23.45** Камедыя «Даю год».
**1.25** Камедыя «Я нармальна супер гуд».
**3.05** Трылер «Зыходны код».
**4.40** Мюзікл «У рытме сэрца».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Бедны, бедны Павел».
**8.10** Трылер «Цёмны свет».
**10.00** Камедыя «Назад — на шчасце, або Хто знойдзе Сінюю птушку».
**12.00** Дэтэктыў «Канец аперацыі «Рэзідэнт».
**14.20** Камедыя «Свята пад замком».
**15.40** Драма «Чэмпіёны».
**17.20** Камедыя «З Новым годам, мамы!».
**18.50** Меладрама «Вось гэта каханне!».
**20.20** Баявік «Спіраль».
**22.00** Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
**0.20** Баявік «Брат».
**2.10** Фантастыка «Рэжым поўнага апускання».
**4.20** Прыгоды «1812: Уланская балада».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.43** Зрабі або памры.
**7.28** Паядынак непераможных.
**8.13** Гульні розуму.
**8.38** Займальная навука.
**8.57, 17.59** Навуковыя недарэчнасці.
**9.22, 10.27, 12.41, 16.28** Кіраванне натоўпам.
**9.42** Космас. Прастора і час.
**11.11** Навука будучыні.
**11.56** Больш чым фокусы.
**13.27** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**14.12** Апакаліпсіс. Узыходжанне Гітлера.
**14.57** Горад мурашак.
**15.43** Дзікая прырода Амазоніі.
**17.13** Гульня ў лікі.
**21.00, 0.47, 3.46** Расследаванні авіякатастроф.
**22.31, 2.17** Эвакуацыя Зямлі.
**23.16, 3.02** Уварванне на Зямлю.
**0.01, 5.15** Падземны свет мая.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.15** Мотабітва.
**8.50, 15.30** Хуткія і гучныя.
**9.40, 16.20, 6.05** Мяцежны гараж.
**10.30** Брыстальскі заліў.
**11.20** Залатая ліхаманка.
**13.00, 4.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**13.50, 22.10** Бітвы за кантэйнеры.
**14.40** Бітва за нерухомасць.
**18.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**23.00** Востраў.
**23.50** Эфект Карбанара.
**0.40** Мяцежнікі ледзянога возера.
**1.30** Голыя і напалоханыя.
**2.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**3.10** Хлопцы з Юкана.
**4.50** Маланкавыя катастрофы.
**7.05** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.

## Zамор'е

### НЕ ПАШАНЦАВАЛА Ў КАХАННІ? ПАКЛАПАЦІСЯ ПРА ТАРАКАНАЎ!

**Заапарк Сан-Францыска прапануе ўсім няшчасным закаханым арыгінальны спосаб вылечыць разбітае сэрца: узяць пад апеку найбольш агідных насельнікаў звярынца, такіх як мадагаскарскія шыпячыя тараканы і пустынныя валасатыя скарпіёны.**



Гэтых жывёл, якія не карыстаюцца асаблівай любоўю і папулярнасцю наведвальнікаў, можна ўзяць пад апеку ў памяць аб былых каханках у рамках адмысловай праграмы, прымеркаванай да Дня закаханых. «Гэтыя бесхрыбетныя агрэсіўныя, актыўныя і вядуць пераважна начны лад жыцця. Як і вашы былыя, яны звычайна хаваюцца ў нізінах, дзе капаюць мудрагелістыя норы, — гаворыцца на сайце заапарка пра гіганцкіх скарпіёнаў. — Як і самі-ведаеце-хто, яны чакаюць прыдатную ахвяру, нападаюць на яе і джаляць, а затым раздзіраюць нерухомае цела на кавалкі і з'ядаюць».

Усяго за 50 долараў заапарк адправіць дабрачынцу імянны сертыфікат і копію жывёлы ў выглядзе мяккай цацкі. У сваю чаргу, паштоўка ад мадагаскарскага таракана, якая, на думку супрацоўнікаў заапарка, сімвалізуе «шматкі асабістага жыцця», абыдзецца ўсяго ў 25. «Калі вам пашанцуе, гэтае шчодрае ахвяраванне ачысціць вашу карму, і на вашым шляху больш ніколі не сустрэнецца таракан», — гаворыцца ў паведамленні заапарка.

### РАХУНАК ЗА ПРОПУСК... ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

**Пяцігадоваму англічаніну выставілі рахунак за тое, што ён не прыйшоў на дзень нараджэння аднакласніка.**



Алекс Нэш збіраўся пайсці на свята, якое павінна было адбыцца ў снежні 2014 года. У апошні момант яго бацькі ўспомнілі, што ў гэты дзень яны едуць у госці да бабулі і дзядулі, і адмянілі паход сына на дзень нараджэння.

Праз некалькі тыдняў хлопчык вярнуўся са школы з рахункам на 15,95 фунта (каля 24 долараў), падпісаным Джулі Лоўрэнс — маці яго аднакласніка. Гэтую суму сям'я Лоўрэнса выдаткавала на візіт Алекса, які не адбыўся. Бацька Алекса, Дэрэк, спачатку падумаў, што гэта ўсяго толькі жарт, аднак улічыўся ў тэкст, і зразумеў, што рахунак сапраўдны. Пасля таго, як ён адмовіўся аплачваць чэк, сям'я Лоўрэнс прыняла рашэнне падаць у суд за нявыплату рахунку.

### ПАКУЛЬ ЖАНЧЫНЫ ВЫБІРАЮЦЬ, МУЖЧЫНЫ ГУЛЯЮЦЬ

**У краме адзення ў англійскім Нотынгеме з'явіліся гульнявыя прыстаўкі для мужчын, якія сумуюць у чаканні сваіх спадарожніц.**

З'яўленне стэнда з відэагульнямі выклікала бурную рэакцыю ў карыстальнікаў сеткі. Наведвальнікі сайта Reddit.com пакінулі пад фотаздымкам каментарыяў больш за 700 каментарыяў. Адзін з іх удакладніў, што падобныя стэнды з'явіліся і ў іншых крамах сеткі ў Вялікабрытаніі і іншых краінах. Карыстальнікі адзначылі, што часам стэнды з кансолямі размяшчаюць у мужчынскіх аддзелах.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

■ Ваш кашалёк

## Выдаткі на самае неабходнае

### З наступнага месяца зменіцца памер мінімальнага спажывецкага бюджэту

**Згодна з новай пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, мінімальны спажывецкі бюджэт на аднаго члена сям'і з чатырох чалавек на перыяд з 1 лютага па 30 красавіка вырасце да 2 мільёнаў 158 тысяч рублёў. Гэта на 2,8 працэнта (58 тысяч) больш за цяперашні нарматыў.**

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт працаздольнага насельніцтва складзе 2 мільёны 766 тысяч рублёў, пенсіянераў — 2 мільёны 165 тысяч, студэнтаў — 2 мільёны 139 тысяч. Для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў гэты нарматыў установяць у памеры 1 мільёна 702 тысяч, для малых ад 3 да 6 гадоў — 2 мільёнаў 229 тысяч. Мінімальны спажывецкі бюджэт дзіцяці ва ўзросце 6–18 гадоў павялічыць да 2 мільёнаў 375 тысяч, а аднаго члена маладой сям'і з трох чалавек — да 2 мільёнаў 339 тысяч.

Гэты нарматыў пераглядаецца кожны квартал у коштах апошняга месяца для шасці сацыяльна-дэмаграфічных груп і двух сем'яў рознага складу. Ён уяўляе сабой выдаткі на набыццё спажывецкіх тавараў і паслуг, неабходных, каб задаволіць асноўныя фізіялагічныя і сацыяльна-культурныя патрэбы чалавека.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Здарэнне

## Хацеў прадаць долары...

**У сталіцы за збыт валюты па завышаным курсе затрымалі мужчыну.**

— «Кантрольная закупка» адбылася на паркоўцы аднаго са сталічных гандлёвых цэнтраў па праспекце Пераможцаў. Збытчыкам валюты аказаўся грамадзянін Афганістана, які цяпер прызнаны бежанцам у Рэспубліцы Беларусь, — расказала **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУЕВІЧ**. — Мужчына быў затрыманы супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі райаддзела разам з падатковымі інспектарамі. Ён спрабаваў прадаць 6 тысяч долараў па курсе 17 тысяч рублёў. Затрыманаму пагражае штраф да 100 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Таямніцы прафесіі

# ПАДЗЕМНАЕ ЖЫЦЦЁ СТАЛІЦЫ,

## або Адзін дзень у кабіне машыніста метро

**За суткі сталічная падземка перавозіць каля 900 тысяч пасажыраў. Жыхары Мінска лічаць метро самым надзейным, камфортным і хуткім відам гарадскога транспарту. А ці ведаюць яны што-небудзь пра таго, хто кіруе цягніком? Карэспандэнту «Звязды» ўдалося высветліць, чаму машыністы мінскага метро не начуюць дома, за што іх «тузаюць» дыспетчары і каго яны завуць гора-пасажырамі.**



— Тут маё рабочае месца, — сказаў Аляксей, запрасіўшы зайсці ў кабіну машыніста.

### ЗДАРОЎЕ, ЯК У КАСМАНАЎТА!

— Глядзіце пад ногі і нічога тут не чапайце! — папярэдзілі мяне адразу, як толькі мы зайшлі ў дэпо мінскага метро. — Добра, што абутак у вас зручны. Гэта вам не па вуліцы гуляць.

Сапраўды, шпількі тут не да месца. Велізарнае памяшканне, гукі рамонтных работ і каля пятнаццаці пастаўленых у шэраг цягнікоў хутка нагадаюць вам пра гэта.

— Да нас сюды дзяўчыны заходзяць рэдка, таму бачыць тут жаночы твар неяк нязвыкла, — звяртаецца да мяне Аляксей Палубінскі, машыніст электрацягніка. — Жанчын-машыністаў у нас няма. Здаецца, на самым пачатку працы мінскай падземкі было некалькі, але сёння цягнікамі кіруюць толькі мужчыны. Вытрымаць такую нагрузку не кожны зможа!



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дэпо мінскага метро. Адсюль адпраўляецца па маршруце электрацягнік, якім кіруе машыніст Аляксей Палубінскі.

І не кожнага, як высветлілася, возьмуць! Каб стаць вадзіцелем падземнага транспарту, трэба прайсці сур'ёзнае медыцынскае абследаванне. Здароўе павінна быць, як у касманаўта! Дарэчы, медкамісію ўсе вадзіцелі метро праходзяць штогод бясплатна, але ў абавязковым парадку, незалежна ад узросту і стажу працы.

Аляксей кіруе падземным транспартам ужо чатырнаццаць гадоў. Спачатку скончыў Мінскі каледж чыгуначнага транспарту, а потым пайшоў на курсы па падрыхтоўцы машыністаў метро. Навучанне працягваецца паўгода, пасля — іспыты. Акрамя тэорыі, «маладыя байцы» дэманструюць, як павінен весці сябе машыніст у выпадку надзвычайных сітуацый. Дзеля гэтага мадэлююцца спецыяльныя ўмовы, як мага больш набліжаныя да рэальнага жыцця. За пяць хвілін сапраўдны машыніст павінен ліквідаваць усе няспраўнасці і працягнуць рух.

### «ПАСАЖЫРАЎ НЕ ХВАЛЮЕ, ШТО НЕХТА З МАШЫНІСТАЎ НЕ ВЫСПАЎСЯ»

— Добра памятаю свой першы рэйс. Хваляваўся вельмі. Усё баяўся не тую кнопку націснуць, — дзеліцца сваімі ўспамінамі Аляксей. — Але ўсё абышлося.

Я ж хвалявалася ад таго, што ў такой маленькай кабіне машыніста ненаўмысна што-небудзь зачаплю!

— Чаму тут так цесна? — пытаюся.

— Нам хапае! Мы тут у футбол гуляць не збіраемся, — адказвае Аляксей. — Усё неабходнае, каб адкрываць і закрываць дзверы, тармазіць, паскараца, сачыць за прыборамі, у кабіне змяшчаецца.

Цікава, што цягнік, у разуменні звычайнага чалавека, «паваротаў» не мае. Дакладней тое, што ўсе называюць «паваротамі», у машыністаў з'яўляецца «крывымі ўчасткамі». Цягнік праходзіць іх, і колы не паварочваюцца за кошт ухілу шляхоў.

— Хвілін за дзесяць да пачатку працы праходзім «хуткую медкамісію» (дыхаем у алкатэстар, мераем ціск), правяраем гатоўнасць цягніка да працы і выязджаем. Звычайна едзем з хуткасцю 40-50 км/г (максімальная хуткасць цягніка — 80 км/г). Вельмі важна прытрымлівацца графіка руху. Але ў «час пік» гэта зрабіць бывае складана. Інтэрвал нявялікі, усяго дзве хвіліны, а пасажыры ўсё роўна не хочуць чакаць наступнага саставу і пачынаюць трымаць дзверы. Як вынік — цягнік ад'ехаў на дзесяць секунд пазней і, адпаведна, на наступную станцыю спазніўся. За падобныя адхіленні машыніста «тузаюць» дыспетчары, а гэта не вельмі прыемна, — дзеліцца Аляксей.

— Затое, напэўна, пасля такога напружанага дня спіцца добра? — цікаўлюся я.

— Сон моцны, скардзіцца грэх. Але і да своеасаблівага нестабільнага графіка працы прывыкнуць трэба. Машыніст можа працаваць два дні запар у дзень, затым — у ноч, потым зноў — у дзень. Але змена абавязкова павінна доўжыцца не больш за сем гадзін, — тлумачыць мой суразмоўца.

Акрамя гэтага, на ўсіх канцавых станцыях ёсць пакоі адпачынку для супрацоўнікаў метро. І калі машыніст прывёў апошні цягнік, які прыбывае а палове другой ночы, тады ён едзе не дадому, а адсыпаецца тут да наступнай змены.

— Самае складанае ў нашай працы — гэта ўменне сканцэнтравацца. Ад увагі і засяроджанасці кожнага машыніста залежыць якасць работы метро. Наша задача — своечасова і без здарэнняў даставіць пасажыраў на патрэбную станцыю. Іх не павінна хваляваць тое, што нехта з машыністаў сёння не выспаўся ці моцна стаміўся пад канец змены, — расказвае Аляксей.

### ЛЕПШ ЧЫТАЙЦЕ КНІЖКІ!

— Аляксей, а людзі пад цягнік падаюць часта? — не вытрымліваю я і задаю пытанне, якое хвалявала з самага пачатку размовы.

— З гэтым мне, напэўна, пашанцавала. На маёй змене няшчасных выпадкаў не было. А вось калегам даводзілася ратаваць гора-пасажыраў, — сур'ёзна адказвае Аляксей. — У падобнай сітуацыі машыніст павінен імгненна затармазіць. Добра, што тармазы — «зверскія». Пасля гэтага забараняецца нават на сантыметр зрушваць цягнік, каб, не дай Бог, не дацiснуць пасажыра. Напружанне, зразумела, адразу адключаюць. Выклікаецца спецыяльная брыгада, якая будзе выцягваць чалавека, хуткая дапамога, міліцыя, — тлумачыць машыніст.

Гэта вельмі страшна. А калі яшчэ ўлічваць, што дзявяноста адсоткаў — суіцыд, а не проста няшчасныя выпадак, то становіцца жудасна.

— Вось вы, Кацярына, слухаеце музыку ў метро ў навушніках? — рэзка запытаў мяне Аляксей.

— Слухаю, але рэдка. Я больш чытаць у метро люблю, — адказваю я.

— Лепей чытайце. Так вы хоць будзеце чуць усе аб'явы, якія, дарэчы, робіцца менавіта для пасажыраў! Для вашай бяспекі, а вы ігнаруеце гэта. Нельга так.

Дарэчы, самім машыністам падчас руху нельга ні музыку слухаць, што дазволена, напрыклад, кіроўцам аўтобусаў, тралейбусаў, ні па мабільным тэлефоне размаўляць. Для такіх спраў існуюць напарнікі. На працягу змены машыніста падмяняе напарнік праз кожныя дзве гадзіны: у гэты час вадзіцель цягніка можа прайсці ў пакой адпачынку паесці і аднавіць сілы.

— Цікава, а ці мяняецца з часам культура пасажыраў?

— Не ведаю, але мне здаецца, што людзі як раней спяшаліся, так і цяпер спяшаюцца. Сённяшні рытм жыцця не дазваляе паводзіць сябе па-іншаму. Усоды паспець — гэта нармальнае жаданне. Але чым больш пасажыраў, тым складаней становіцца праца машыніста. Адказнасці дадаецца.

Завяршыла размову з Аляксеем і вырашыла, што дадому паеду на метро. У вагоне электрацягніка я добра ўяўляла, як адбываецца кіраванне падземным транспартам, і ехаць ад гэтага было неяк спакайней. Ведала, што маё жыццё на гэтыя кароценькія тры-чатыры станцыі знаходзіцца ў руках прафесіяналаў.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ**

■ Выставы

# АКУНУЦЦА Ў ПАДЗЕІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## можна ў Магілёўскім мастацкім музеі імя Масленікава

**На палотнах героі Першай сусветнай вайны, закранутыя чорным крылом агульнай бяды. Удзельнікі пленэра міжнароднага культурна-асветніцкага праекта грамадскага аб'яднання «Беларускі зялёны крыж» і Мінкультуры «Перакліча стагоддзяў: Першая сусветная вайна і сусвет сёння» ўвасобілі ў гэтых работах свае ўяўленні пра падзеі стагадовай даўніны. І іх творы сапраўды кранаюць сэрца. Перад вачыма своеасаблівы дыптых. Знізу, на зямлі — пастаральны пейзаж з дзяўчынай і юнаком на ўзгорку, зверху, у небе — калючы дрот і зморапыя хлопцы з суровымі тварамі і аўтаматамі наперавес. Той страшны сусвет нібы навіс над такім нетрывалым мірным і цісне на яго са злавеснай сілай.**

— Мы пабывалі ў мясцінах, праз якія праходзіла лінія руска-нямецкага фронту — Вілейцы, Смаргоні, Крэве, іншых гарадах, — расказвае мастацкі кіраўнік пленэра Дзмітрый Пухоўскі. — Адбылося шмат розных сустрэч, экскурсій на тэму мінулай вайны. І вельмі запомніўся факт, які расказаў гісторык са Смаргоні. На іх тэрыторыі засталося шмат нямецкіх дотаў, і неяк на месцы аднаго з іх дзеці расклалі вогнішча і падарваліся. Потым знайшлі снарады Першай сусветнай, завезлі іх у кар'ер і ўзарвалі. У паветры паплыў нейкі незразумелы дым. І адразу ўспомнілася, што пад Смаргонню немцы неаднаразова рабілі газавыя атакі. Пасля іх яны ішлі з дубцамі, на канцах якіх знаходзіліся шыпы (так званыя «моргэн штэрн» — ранішняя зорка), і дабівалі салдат.

Праект, які закліканы ўзгадаць пра мінулыя трагічныя падзеі, аб'яднаў творчых людзей з Беларусі, Расіі, Украіны. Адметна, што ўдзел у пленэры прымалі як ужо масцітыя мастакі, так і пачаткоўцы. Моладзь мела магчымасць пераняць вопыт у старэйшых і зразумець, чаму так важна ў сваёй рабоце не скаЗіць праўду пра вайну. Шмат чаго цікавага яны пачулі падчас працы ў Магілёве, горадзе, дзе ў гады Першай сусветнай знаходзілася Стаўка цара Расійскай імперыі Мікалая II.



— Наколькі важныя такія праекты, як гэты? Яны ж тычацца падзей даўно мінулых дзён... — цікаўлюся ў Дзмітрыя Пухоўскага.

— Ведаеце, адзін з нямецкіх военачальнікаў пасля паразы Германіі ў Першай сусветнай вайне сказаў з надзеяй на рэванш: «Мы яшчэ вернемся сюды гадоў праз 20». Менавіта столькі часу трэба, каб вырасла новае пакаленне. Той, хто бачыў жахі вайны, ніколі не возьмецца за зброю. А вось маладыя, калі іх правільна ідэалагічна апрацаваць, пойдуць ваяваць. Таму выхаванне маладога пакалення, вяртанне яго ў мінулы час — наша першасная задача. Нельга дапусціць разрыву з гісторыяй.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

■ Дэмаграфія

# І радзей, і пазней

**Скарачэнне колькасці насельніцтва краіны будзе адбывацца ў выніку адмоўнага паказчыка нараджальнасці.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Паводле прагнозаў, найбольшыя дэмаграфічныя страты закрануць сельскую мясцовасць. Да 2030 года гарадское насельніцтва ў Беларусі павялічыцца на 2,6 працэнта — з 7,22 млн да 7,41 млн чалавек, і яго доля дасягне 80 працэнтаў. Колькасць сельскага насельніцтва за той жа час скароціцца амаль на 400 тысяч і складзе 1,85 млн чалавек. Колькасць насельніцтва зменшыцца ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Мінска, насельніцтва якога будзе расці павольнымі тэмпамі, паведамляе Рэсурсны цэнтр ЮНФПА.

Наогул да 2050 года колькасць насельніцтва зменшыцца ў 33 краінах. Доля эканамічна і сацыяльна неактыўных пажылых людзей пры гэтым будзе расці, а колькасць працаздольнага насельніцтва скарачацца.

Вядома, што ўзровень нараджальнасці наўпрост залежыць ад узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства і сацыяльных змен, якія адбываюцца ў грамадстве. У традыцыйным аграрным грамадстве дзеці былі найперш дадатковымі «працоўнымі рукамі». Працуючы разам з бацькамі, яны набывалі працоўныя навыкі натуральным чынам. Нараджэнне дзяцей мела эканамічны сэнс. У развітым індустрыяльным грамадстве дзеці павінны доўга вучыцца, каб атрымаць кваліфікацыю, якая адпавядала б сучасным патрабаванням. Каб забяспечыць нашчадкам належныя ўмовы, дарослыя аддаюць перавагу меншай колькасці дзяцей.

Для Беларусі характэрная і тэндэнцыя павелічэння сярэдняга ўзросту жанчын пры нараджэнні першага дзіцяці. У апошні час гэта 25,5 года, а наогул сярэдні ўзрост жанчыны пры нараджэнні дзіцяці складае 28 гадоў.

Да змяншэння нараджальнасці вядзе, як ні круці, жаночая эмансіпацыя. Узровень нараджальнасці ў Беларусі досыць нізкі. Сумарны каэфіцыент складае 1,6 на адну жанчыну. Нават нязначны рост гэтага каэфіцыента ў апошні час (да 1,7) не забяспечвае звычайнага ўзнаўлення.

Паляпшэнне становішча жанчыны на рынку працы стымулюе нараджальнасць. Так, у ЗША сумарны каэфіцыент нараджальнасці — 2,06, Нідэрландах — 1,76, Фінляндыі — 1,83, Швецыі — 1,90, Нарвегіі — 1,88. Але ў цэлым у Еўропе сярэдняя колькасць дзяцей, народжаных адной жанчынай (сумарны каэфіцыент нараджальнасці) роўная 1,5.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ На слыху

# ВЫКАНАЎ ПЛАН — АТРЫМАЙ ГРОШЫ ЦАЛКАМ

## Памылкі кіраўнікоў не паўплываюць на прэміі работнікаў

**Савет Міністраў унёс змены ў ліпеньскую пастанову №744. З дакумента выключылі норму, якая забараняла наймальнікам (дзяржаўным прадпрыемствам і арганізацыям з доляй уласнасці дзяржавы больш за 50 працэнтаў) павышаць заработную плату, калі яна расце хутчэй, чым прадукцыйнасць працы. На практыцы гэта азначае, што добрасумленныя работнікі не будуць адказваць за пралікі кіраўніцтва ў маркетынгавай ці фінансавай палітыцы.**

— Калі чалавек ва ўстаноўлены тэрмін і якасна выканаў усё, што ад яго патрабуецца, то і заробак яму павінны выплаціць у поўным аб'ёме, — каментуе змены ў пастанове старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА. — Работнікі аб'ектыўна не гатовы з разуменнем ставіцца да памяншэння аплаты па прычынах, якія ад іх не залежаць.

Людзі на працягу паўгода негатыўна выказваліся пра перакладанне на іх адказнасці за памылкі кіраўніцтва прадпрыемстваў, аддзелаў збыту, планавання і маркетынгу. Прадстаўнікі працоўных калектываў не раз звярталі ўвагу на тое, што шэраг наймальнікаў пачаў змяншаць фонды заработнай платы за кошт прэмій па выніках гаспадарчай дзейнасці. Некаторыя кіраўнікі і ўвогуле адмянілі пункты калектыўных дагавораў, у адпаведнасці з якімі выплачваліся надбаўкі за прафесійнае майстэрства і стаж працы, матэрыяльная дапамога да адпачынку.

У той жа час у Федэрацыі прафсаюзаў згодны з тым, што павялічыць заробкі работнікаў можна толькі пры павышэнні прадукцыйнасці працы і гэта галоўны прынцып эфектыўнай дзейнасці арганізацыі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

■ Хто каго?

# «ЛЕПШЫЯ СЯБРЫ» — У ВЫШЭЙШАЙ ЛІЗЕ КВЗ

**Сёлета Беларусь у вышэйшай лізе КВЗ прадставіць зборная Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта «Лепшыя сябры», якая была адабраная па выніках выступлення каманд на фестывалі «КіВіН-2015» у Сочы.**



У 1/8 фіналу беларускім хлопцам давядзецца сустрэцца са зборнай Грузіі (Тбілісі), зборный МФЮА (Масква — Валгаград), зборнай сельскагаспадарчай акадэміі (Іркуцк), а таксама з любімцамі публікі камандай «Дэтэктыўнае агенцтва «Месяцавае святло» (Белгарад) — удзельнікамі мінулагодняга фіналу.

Гульня адбудзецца 14 сакавіка. Будзем хварэць за нашых!

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Недзіцячыя гульні

# ЦАЦКІ, ЯКІЯ НЕ ЗМАГЛІ ПРЫНЕСЦІ РАДАСЦІ

## У афганцаў канфіскавалі нелегальны кітайскі тавар

**Супрацоўнікі АБЭЗ Кастрычніцкага РУУС сталіцы разам з падатковымі інспектарамі спынілі дзейнасць грамадзян Афганістана, якія займаліся незаконнай рэалізацыяй буйной партыі цацак.**

Адсутнічалі дакументы, якія сведчылі б пра легальнасць увозу і набыцця прадукцыі. Падчас праверкі было высветлена, што кітайскі тавар быў увезены з тэрыторыі Расіі ў Мінск для наступнай рэалізацыі без адпаведных дакументаў. У складскіх памяшканнях аператыўнікі знайшлі каля 4,5 тысячы цацак на агульную суму звыш 685 мільёнаў рублёў. Вінаватым асобам пагражае адміністрацыйная адказнасць за рэалізацыю, захоўванне і транспартаванне тавараў з парушэннем дзейнага заканадаўства ў выглядзе штрафных санкцый у памеры ад 50 базавых велічынь з канфіскацыяй тавару і выручкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# АЛЁ, НАРОД НА ПРАВАДЗЕ!

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

## «ХІМІЮ ВЕДАЦЬ ТРЭБА!»

У доўгія піліпаўскія вечары цяжка, мусіць, усім, а ўжо старым ды пажылым...

Чытаць ці вязаць — вочы «не свецяць», ткаць ці прасці — патрэбы няма, дзень пры дні тэлевізар глядзець — звар'яцееш...

Застаецца, значыць, адно — успамінаць сваё, даўно пражытае і такое ж, як гэтыя вечары, змрочнае. Бо там — вайна. Ды і пасля яе дзецям-сіротам хапіла напоўніцу. Мала таго, што жыць давялося ў холадзе ды голадзе, дык яшчэ і вучыцца ўсяму: як запрагаць каня, як араць, баранаваць ды сеяць, як касіць і вастрыць касу, як калоць дровы, як жаць і лён ірваць, як хлеб пячы... А трэба ж было яшчэ і ў школу хадзіць, урокі вучыць...

Мая аднавяскоўка Марылька больш-менш паспявала па ўсіх прадметах, а вось па хіміі... Як толькі гэты прадмет — у яе то галава «забаліць», то жывот пацісне. Зморшчыцца, бедная, у крук сагнецца. Матулька згледзіць ды і пашкадуе. Скажа: «Пасядзі сёння дома, дзіцятка»... І сапраўды — на халеру дачцэ тая хімія? Толькі мазгі забіваць.

Дарэмна яны так думалі! Як паказала далейшае жыццё, трэба (ды што там — жыццёва важна!) ведаць гэты прадмет, ведаць, напрыклад, якая рэакцыя адбываецца пры злучэнні $H_2O$ з $CO_2$. А інакш...

У той год Марылька (а яна ўжо за гаспадыню была) выкарміла здаравеннага вепрука. Кілаграмаў, мусіць, пад 300: перад Калядамі двое мужыкоў ледзьве закалолі, а паспрабавалі ўсцягнуць на падмостак, каб асмаліць — рады не далі. І так ля яго, і гэтак, — пакрракталі ды пайшлі па вёсцы дапамогі прасіць.

Талакой, можна сказаць, кабана ўсцягнулі — асмалілі, разабралі: здору выкацілі — будзь здароў!.. Марылька, спарадкаваўшы іншае, хацела на тлушч яго распусціць: на алеі ў вёсцы тады не смажылі, значыць, спатрэбіцца.

Але ж пакруцілася гаспадыня па хаце, — пасудзіны пад гэткі аб'ём якраз і няма.

Ёй бы, галаве садовай, у некага пазычыць, альбо той здор на два гаршкі раздзяліць... Не, яна ўсё «стаптала» ў адзін. Накрыла зверху патэльняй — і шусь у печ, дзе дровы гараць. Яшчэ і засланку прыткнула.

Чуе хвілін праз колькі — нешта шыпіць. Яна зірк у печ — тлушч з-пад патэльні ручайкамі «бяжыць»... Загараецца... Дым чорны-чорны такі, і смурод на хату ідзе...

Трэба нешта рабіць! Марылька ў конаўку вады і на под — бух!

Полымя шуганула такое, што, здавалася, паднябенне ў печы парве!.. Не змагло — на Марыльчына шчасце! Тады агонь на прыпечак, маланкаю да сцяны насупраць — і назад у комін...

Шчасце, што гаспадыня адхінуцца паспела — у той момант не стала на шляху... А то магла б без вачэй застацца, скалечыцца на ўсё жыццё.

Карацей, перахрысцілася яна, бедная, падзякавала Госпаду, што ўратаваў. І дзецям наказала: хімію ведаць трэба!

**Н. ШЧУРКО,**

*г. Магілёў*

## СЯБРАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА...

Маё першае працоўнае месца — васьмігодка ў невялікай вёсцы Поці, што на беразе Бярэзіны. Настаўнікі там былі як настаўнікі, бацькі як бацькі і дзеці як дзеці: нехта вучыўся лепш, нехта горш...

Таццяна Ільінічна, мая старэйшая каляжанка, цудоўна ладзіла з усімі, найперш — з вучнямі. Яны вельмі палюбілі і настаўніцу, і яе ўрокі, старанна да іх рыхтаваліся. Але ж не заўсёды... Не ўсе.

Пяцікласнік Віця не зрабіў неяк хатняга задання. Прыйшлося пакінуць яго пасля ўрокаў. Пакуль займаліся, пакуль разам чыталі-пісалі, на дварэ сцямнела. А жыў хлапчук у суседняй вёсцы, за два кіламетры. Таццяне Ільінічне, атрымліваецца, трэба завесці малога — альбо дамоў да яго, альбо да сябе.

Свая хата была значна бліжэйшая — туды і пайшлі.

Свёкар са свекрывёй (настаўніца жыла ў сям'і свайго мужа) усё зразумелі: дзіця прывецілі, пасадзілі разам вячэраць, пакінулі начаваць. Назаўтра адправілі ў школу...

З таго вечара прайшло, можа, з тыдзень ці два, — Віця зноў прыйшоў непадрыхтаваны.

— Як табе не сорамна? — стала ўшчуваць яго Таццяна Ільінічна. — Я ж цябе пакідала пасля ўрокаў. І што — гэта не стала табе навукай?

— Стала, — прызнаўся малы. І, апусціўшы вочы, дадаў: — Я сумысля ўрок не вывучыў.

— Як гэта, — здзівілася настаўніца, — навошта?

— Каб да вас пайсці... Бо ў вас лепей кормяць.

Разгубілася Таццяна Ільінічна: стала ўспамінаць, чым жа яны вячэралі? Здаецца, бульбай з кіслым малаком?.. Атрымліваецца, у Віцевай хаце ўдосталь няма нават гэтага?!

Што рабіць настаўніцы?

Не, яна не стала зноў пакідаць хлапчука пасля ўрокаў, не стала забіраць яго да сябе, але ж часцяком падпільноўвала вучня па дарозе дадому і ў торбачку з кнігамі клала скібку-другую хлеба — то з маслам, то са скрылькамі каўбасы ці сала, што для Віці на той час было вялікім гасцінцам, якім ён шчыра дзяліўся са сваімі малодшымі братамі...

Не ведаю, як іншых настаўнікаў, а мяне ў мае 20 гадоў гэтая гісторыя вельмі ўразіла, прымусіла задумацца, па-новаму паглядзець на дзяцей. І зразумець, што ў працы з імі галоўнае не тое, вывучылі яны ўрок альбо не... Галоўнае — стан душы. Кожнага... Адчуць яго, зразумець, стаць маленькаму чалавеку сябрам — вось што важна. Ці не так?

**Л.В.,**

*Іўеўскі раён*

## А НЕ ПАДМАНВАЙ!

Ну нарэшце дачакаліся: снегу навалiла. У горадзе яшчэ можна было праехаць (камунальнікі пастараліся), а вось у гаражным кааператыве — не. Старшыня толькі пра асноўныя праезды паклапаціўся ды пра сваю «рэзідэнцыю», усё ж астатняе...

Выратаванне галодных, як той казаў, — справа рук іх саміх. А не хочаш ці не можаш, — наймай бамжоў, што побач ашываюцца. Яны за пляшку-другую любыя вароты адкапаюць!.. Пры гэтым, праўда, закідаюць суседнія... Але ж зараз не столькі пра іх.

...Неяк раз, пасля вялікай завеі, на тэрыторыі кааператыву з'явілася адна з аўтаўладальніц, асоба гадоў трыццаці па мянушцы Мармазэль (ну, завуць яе так... Вядома ж, за вочы). Падышла яна, значыць, да свайго гаража і, так бы мовіць, «выпала ў асадак»: суседзі, мусіць, думалі, што яна зімой выязджаць не будзе, і таму ўвесь снег ад сваіх варот перакінулі ёй. У выніку — не падысці, дзвярэй не адчыніць...

З хвіліну Мармазэль «тармазіла» — думала, што ж рабіць? Самой адкідваць снег як быццам не выпадае: не з яе ручкамі, не ў яе боціках на высокіх абцасах... Ды і лапата была ў гаражы.

Прыйшлося ісці да будкі вартаўніка — прасіць дапамогі.

А той і рады: адразу ж «свіснуў» бамжоў, гатовых да любой падпрацоўкі, адразу ж папярэдзіў, што за работу і хлопцам трэба будзе заплаціць, і яму — за пасярэдніцтва. Такса — па бутэльцы «белай» на брата.

Мармазэль абяцала.

— Толькі ж акуратна ўсё зрабіце, — наказвала яна, паказваючы «хлопцам» фронт работы. — Так, каб можна было прайсці, бо ў мяне бачыце, якія боцікі?

«Хлопцы» стараліся! Не менш за гадзіну шчыравалі ў салодкім спадзяванні на пахмелку, на «тушэнне труб» — на абодва бакі раскідвалі снег, чысцілі пляцоўку перад варотамі.

Больш за тое, яны ж потым дапамаглі маладзіцы «адагрэць» замерзлы замок, выпхнуць з гаража яе «ластаўку». Яны ж, можна сказаць, з апошніх сіл — аж пакуль не завялася — штурхалі машыну (у той акумулятар «здох» ад доўгай стаянкі) па заснежаным праездзе...

А вось што далей было, апісваць цяжка, бо, прагрэўшы рухавік, жанчына замкнула гараж, села ў машыну і... паруліла да выезду!

— Алё, гараж! Мармазэль!.. А разлік? А бабло?

— Хлопчыкі, у мяне дробных грошай няма, — прашчабятала ў адказ маладуха. — Я ў горад па справах зганяю і прыеду назад. Тады і заплачу...

Адказаць ёй хлопцы не паспелі: Мармазэль, абдаўшы іх выхлапам з глушыцеля, панеслася «мяняць купюры».

...Вярнулася яна толькі ўвечары. Як нічога ніякага, з «помпай» пракаціла паўз будку злога, як сабака, вартаўніка, звярнула ў свой рад, спынілася... Потым, памалу, праехала трохі наперад... Здала назад. Стала...

Не, памылкі не было: *ля яе* гаража ўзвышалася яшчэ большая, чым раней, гурба снегу.

Не верачы вачам, Мармазэль круціла галавой, азіралася навокал (па-ранейшаму, мусіць, думала, што «прамахнулася», заехала не туды...).

Аднак ніякай памылкі не было: гэта яе вароты схаваліся за высокімі сумётамі. Прычым снегу перад імі не проста накідалі — яго ўтрамбавалі...

Хто гэта мог зрабіць, гадаць не трэба было: на снезе засталіся сляды ад вялізных валёнак, у якіх раніцай хадзілі «хлопчыкі»...

**Раіса ВАСІЛЁВА,**

*г. Гомель*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж — парада:*** *калі вы таксама не ведаеце, што рабіць у «доўгія, піліпаўскія вечары», — чытайце... Добрыя кнігі, часопісы, газеты. І, вядома ж, пішыце. Напісанае, як вядома, застаецца.*

■ Падаткі

# «Шэрая» арэнда каштуе дорага

**Падатковыя органы сталіцы за год злавілі «за руку» амаль тысячу нядобрасумленных кватэраздатчыкаў, паведаміла першы намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінску Надзея БОЛДЫРАВА.**

Такім чынам супрацоўнікі інспекцыі летась выявілі парушэнні падатковага заканадаўства ў 964 арэндадаўцаў. Таму потым, пасля адпаведных працэдур, яны выплацілі ў бюджэт горада каля 900 млн рублёў у якасці падаткаў і штрафаў. Спецыяліст адзначыла, што на працяглы тэрмін кватэры ў Мінску здаюць 56 тысяч чалавек. У параўнанні з папярэднім перыядам іх колькасць павялічылася на 8,2 тысячы. Таксама ў падатковых органах горада на ўліку стаіць 921 індывідуальны прадпрымальнік, які здае жыллё на кароткатэрміновы перыяд. Летась ад гэтай катэгорыі плацельшчыкаў у добраахвотным парадку ў бюджэт Мінска было пералічана 11 млрд рублёў падаткаў. Аднак і па гэтай паслузе не абышлося без парушэнняў. Паводле праведзеных 133 праверак і 44 маніторынгаў кватэр «на суткі», прадпрымальнікамі даплачана ў бюджэт амаль 110 млн рублёў.

Спецыялістамі падатковай службы было адзначана, што асноўнай крыніцай інфармацыі пра парушэнні ў гэтай сферы з'яўляюцца суседзі здымнага памяшкання. Звычайна менавіта яны пішуць заяву аб шуме ў праблемнай кватэры (ці іншых абставінах), пасля чаго сігнал правяраецца. Калі будзе выяўлены факт незарэгістраванай здачы кватэры, тады налічваюцца падаткі і выносяцца адміністрацыйныя спагнанні.

Надзея Болдырава таксама паведаміла, што летась падатковыя органы сталіцы правялі 116 аператыўных праверак фізічных асоб, якія займаюцца перавозкамі пасажыраў. У 54 выпадках устаноўлены паўторныя факты ажыццяўлення незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасці. Паводле гэтых праверак арыштавана 53 аўтамабілі, вінаватыя заплацілі 266 млн штрафу, а тры машыны былі нават канфіскаваны.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

БЕЛАРУСБАНК

## ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (ПРЕДЛОЖЕНИЕ) по срочному банковскому вкладу в иностранной валюте «Валютный экспресс»

1. Подпункт 1.1 Договора срочного банковского вклада в иностранной валюте «Валютный экспресс» на имя Другого лица, изложить в следующей редакции:

«1.1. Другое лицо приобретает права вкладчика со дня предъявления им в письменной форме Вкладополучателю первого требования в отношении вклада по настоящему договору. До предъявления указанного требования в соответствии с настоящим договором пополнять сумму вклада вправе только Вноситель, а путем безналичного перечисления – также третье лицо, но при условии, что в платежном документе получателем платежа указан Вноситель.».

2. Пункт 7 Договора срочного банковского вклада в иностранной валюте «Валютный экспресс», Договора срочного банковского вклада в иностранной валюте «Валютный экспресс» на имя Другого лица, изложить в следующей редакции:

«7. Вкладчик и (или) другие лица вправе пополнять сумму вклада до момента наступления одного из нижеуказанных обстоятельств (событий):

- до момента, с которого по вкладу начисляется пониженная процентная ставка;
- до совершения первой расходной операции наследником (иным правопреемником) вкладчика;
- до дня наступления срока возврата вклада после 3-го (третьего) перезаключения Договора по вкладу в соответствии с подпунктом 5.1. настоящего Договора;
- до дня прекращения или приостановки приема денежных средств во вклад в соответствии с решением уполномоченного органа Вкладополучателя, о чем предварительно сообщается путем размещения информации на официальном сайте Вкладополучателя в сети Интернет (www.belarusbank.by).».

3. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пунктах 1, 2 является первое пополнение (наличное/безналичное) в соответствии с условиями Договора.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Строительный трест №8» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, 49 в составе:**

**ФОРМОВОЧНЫЙ ЦЕХ ЖЕЛЕЗОБЕТОННЫХ ИЗДЕЛИЙ, инвентарный номер 100/С–38913, общей площадью 1273,2 кв.м.**

**РАСТВОРНО-БЕТОННЫЙ УЗЕЛ, инвентарный номер 100/С–77123.**

**Начальная цена лота с НДС (20%) – 9 120 000 000 бел. руб.**

Объекты недвижимости расположены на земельном участке пл. **1,6019 га**, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания растворо-бетонного узла (РБУ) и формовочного цеха железобетонных изделий.

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты за объект: 60% от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 6 (шести) рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола с победителем аукциона, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно равными долями в течение 6 месяцев с даты подписания договора купли-продажи, в соответствии с заключенным договором.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2014 г.*

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона:** | **12.02.2015 г. в 14.00** по адресу: г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний – каб. 230, 231. |
| **Срок окончания приема документов для участия в аукционе:** | Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 10.02.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». |

**Тел.: +375 17-280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1099507, 1099508, 1124014, 1124015, 1124016, 1225953, 1225970, 1226107, 1226139, 1363803, 1117405, 1201873, 1100461, 1214258, 1214261, 1340322, 1340323, 1341120, 1329497, 1354219, 1362760;
- страховой полис комбинированный «Добровольное страхование строений и домашнего имущества граждан; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» (форма 2РН) серия БИ № 0002287;
- добровольное страхование от несчастных случаев (2РН, 2РП) серия НС № 0015745;
- добровольное страхование ответственности перевозчика/экспедитора (2РП) серия ОП № 0000872;
- страховой полис «Универсальный» (2РН, 2РП) серия УП № 0010047.

УНП 100782388

Утерянный страховой полис ЗАО «СК «ЭРГО» серии БО № 381262 **считать недействительным.**

03 марта 2015 г. в 15.00. состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

**Повестка дня:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год и основные направления деятельности общества в 2015 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году и первом квартале 2016 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизора общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизора.

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.
Время регистрации в день проведения собрания с 14.30 до 15.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 16.02.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНН 200246280

ОАО «Світанак» г. Жодино

**ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ**
**на выполнение работ по монтажу и наладке системы контроля герметичности и автоматики безопасности и регулирования парового котла ДЕ 25-14 ГМ, установленного в котельной ОАО «Світанак» г. Жодино.**

Заявки принимаются по адресу:
**г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 11.00 09.02.2015 г.**
За дополнительной информацией обращаться
**по тел.: 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.**

УНН 600038919

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже капитального строения, находящегося в собственности ОАО «Фирма «Вейно» 3 марта 2015 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб. (с учетом НДС – 20%) | Размер задатка, бел. руб. | Характеристика объекта | Условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-91640, общей площадью 2 135,0 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Димитрова, 3Б. Площадь земельного участка – 0,4466 га, для содержания и обслуживания хранилища. | 1 973 712 000 | 197 371 200 | Одноэтажное здание хранилища № 5 1954 г. постройки. Фундамент – бутовый, бетонный; стены – кирпичные; перекрытия – железобетонные; перегородки – кирпичные; крыша – толь; полы – цементные, дощатые; проемы оконные – простые, дверные – простые, металлические ворота. Имеется центральное отопление, водопровод, электроосвещение. | Победитель торгов одновременно заключает договор купли-продажи капитального строения и предварительный договор купли-продажи водопроводной сети (протяженностью 73 м) и электрической сети (протяженностью 75 м) по общей стоимости 7 870 840 (Семь миллионов восемьсот семьдесят тысяч восемьсот сорок белорусских рублей (с учетом НДС – 20%). |

**Начальная цена снижена на 60%.**
**Аукцион состоится 3 марта 2015 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**
**Заявки принимаются ежедневно с 30 января 2015 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.**
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 27 февраля 2015 года до 17.00 часов. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.**
**Заключительная регистрация участников аукциона 3 марта 2015 года с 14.00 до 15.00 часов.**

**Продавец:** ОАО «Фирма «Вейно», 212003, г. Могилев, Могилевская обл., Могилевский р/н, а/г Вейно, тел.: (0222) 202-336, 8-029-842-77-27.

**Организатор аукциона** – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны: 22-21-78, 22-00-89.

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710 с отметкой банка;
- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь –** нотариально удостоверенная доверенность:
- **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя –** доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона, обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в установленном порядке, в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником аукциона) в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – без рассрочки платежа.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 000 000 (Сто миллионов) белорусских рублей: победителем аукциона в случаях не подписания протокола о результатах аукциона, не возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, не заключения договора купли-продажи предмета аукциона; единственным участником аукциона – в случае отказа или уклонения от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, заключения договора купли-продажи предмета аукциона; участниками аукциона, отказавшимися предложить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22-21-78, 22-00-89.**

# КОНКУРС ДЛЯ КІНАТВОРЦАЎ

**Міністэрства культуры аб'явіла адкрыты рэспубліканскі конкурс кінапраектаў. Такая сістэма фінансавання сферы кіно ў нашай краіне ўведзена ў 2012 годзе палажэннем «Аб адкрытым рэспубліканскім конкурсе кінапраектаў на вытворчасць фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў», зацверджаным пастановай Савета Міністраў краіны ў лютым 2012 года. У тым жа 2012 годзе прайшлі два конкурсы, на тым і заціхла.**

Нарэшце, ужо ў 2015-м, з'явіліся свята і надзея. На ігравое кіно бюджэт выдаткоўвае Br40 млрд. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца праекты з наступнымі тэмамі: «Выдатныя гістарычныя дзеячы — ураджэнцы Беларусі», «Сацыяльная маладзёжная праблематыка, якая раскрывае праблемы наркаманіі», «Гераічная барацьба савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «Дзейнасць сучасных абаронцаў Айчыны па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь». Мецэнат мастацтва кіно ў асобе дзяржавы дэтальна прапісаў тэмы, фармат, колькасць серый і хронаметраж. Не мецэнат — заказчык. Праект ігравога фільма фінансуецца не больш як на 70 працэнтаў.

Прыкладная сума сродкаў на неігравое кіно складае Br2 млрд 200 млн, затое фінансаванне праекта можа дасягнуць 100 працэнтаў ад кошту фільма. Тэмы наступныя: «Найноўшая гісторыя незалежнай Рэспублікі Беларусь», «Дасягненні Рэспублікі Беларусь у розных галінах і сферах дзейнасці», «Настаўнікі беларускай школы» — па адным фільме.

Праекты для ўдзелу ў конкурсе будуць прымацца да 16 сакавіка. Падвядзенне вынікаў працягнецца да 2 красавіка.

Ці зможа нешта знятае па гэтых тэмах прэтэндаваць на Залатую пальмавую галіну?

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# СВЕТЛАЕ ІМЯ



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Без бацькі — паўсіраты, а без маці — ... (прык.). **4.** Матуля родная — ... незгасальная (прык.). **6.** «Ох ты, міленькі мой,\\Я цябе пацешу:\\Куплю скрыпку, ... ,\\На шыю павешу». Прыпеўка. **7.** «Вінаваты, ...,\\Вельмі вінаваты.\\Ты даруй мне, ...,\\За мой шлях гарбаты». З верша Я.Мальца «Захварэла мама». **9.** «Далёка дарога\\З той хаты відна,\\Жыве ў ёй\\Старэнькая маці ...». З верша П.Броўкі «Маці». **11.** Той, хто займаецца дэмагогіяй. **12.** «А на гары дом — дом,\\А ў лагчыне хатка.\\Харошая паненачка,\\Ды ліхая ...». Прыпеўка. **14.** У дзіцяці забаліць палец, а ў маці — ... (прык.). **15.** Свату першая чарка і першая ... (прык.). **16.** Рэзкі, парывісты рух рукамі або целам. **17.** «Ці я ў мамы не ...,\\Ці я не дачушка?\\Руса каса да пояса,\\Чырвоная стужка». Прыпеўка. **18.** Геаметрычнае цела. **20.** Адна ў чалавека родная маці, адна ў яго і ... (прык.). **23.** Тое, што і царква. **24.** І ў вераб'я свая ... (прык.). **25.** «Я слаўлю мамы светлае імя -\\Пяшчотнае, нібыта яблынь ...». З верша Т.Дзям'янавай «Я слаўлю маму». **26.** У сваёй маткі ўсе ... гладкі (прык.). **27.** Касцюм танцоўшчыцы.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Сухі, гарачы вецер пустыні. **2.** Без прыкмет не будзе хлеба на ... (прык.). **3.** Хацела мама за пана, але ... ўзяў (прык.). **4.** Мацярынскі гнеў, што вясенні ... : і многа выпадзе, ды хутка растае (прык.). **5.** Дзяржанне ў прыладах працы. **8.** «Біла ж мяне ...\\Канапляным прутам.\\-Не хадзі ты, дачушачка, з гэтым баламутам». Прыпеўка. **10.** «Сэрца маці — гэта бездань, у глыбіні якой заўсёды знойдзецца ...». Цытата Анарэ дэ Бальзака. **13.** Была б ..., а будзе хата (прык.). **14.** ... бацек на гаду, адна маці на раду (прык.). **17.** Грошы, якія атрымліваюцца ад якой-небудзь дзейнасці. **19.** Дарагая тая хата, дзе любяць госця і ... (прык.). **20.** На дачок матка — батрачка, пакуль ... не сашчэпіць (прык.). **21.** ... на двор, то і чарка на стол (прык.). **22.** Нізкі жаночы або дзіцячы голас.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ**, *г. Дзяржынск.*

## Праверце, калі ласка, адказы

**Па гарызанталі:** 1. Сірата. 4. Свечка. 6. Барабан. 7. Мама. 9. Адна. 11. Дэмагог. 12. Матка. 14. Сэрца. 15. Палка. 16. Рывок. 17. Дачка. 18. Конус. 20. Радзіма. 23. Храм. 24. Сям'я. 25. Квецень. 26. Дзеткі. 27. Туніка. **Па вертыкалі:** 1. Самум. 2. Абед. 3. Тата. 4. Снег. 5. Асада. 8. Матулечка. 10. Дараванне. 13. Агата. 14. Сорак. 17. Даход. 19. Свята. 20. Рукі. 21. Зяць. 22. Альт.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.00 | 17.46 | 8.46 |
| Віцебск — | 8.55 | 17.31 | 8.36 |
| Магілёў — | 8.50 | 17.36 | 8.46 |
| Гомель — | 8.41 | 17.38 | 8.57 |
| Гродна — | 9.15 | 18.02 | 8.47 |
| Брэст — | 9.09 | 18.08 | 8.59 |

**Месяц**

*Першая квадра 27 студзеня. Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**

*Пр. Антона, Паўла. К. Марціны, Марціна, Мацея, Себасцьяна, Фелікса.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Мы з маёй дзяўчынай вырашылі адначасова зрабіць аперацыю па змене полу. А потым аказалася, што яна пажартавала. Вось і давярай потым нам, бабам.**

Пастаўце сабе за мэту — у новым годзе не кінуць смаліць, не кінуць піць, не пачаць займацца спортам і не пахудзець. І ў вас усё атрымаецца.

**— Чаму гэты ложак называецца паўтараспальным?**

**— На ім спяць муж і яго палова.**

«Трэба крыху раней у краму прыехаць, каб мала народу было, і хутка ўсё купіць, і ў чэргах не стаяць», — падумаў увесь горад.

**Жонка:**

**— Нешта ў мяне левая рука свярбіць... Гэта, напэўна, да грошай.**

**Муж (не адрываючыся ад газеты):**

**— Не дам!**




caricatura.ru

**НАРОДЖАНЫЯ 30 студзеня**

**Гэта таленавітыя кіраўнікі, якія валодаюць арганізацыйнымі здольнасцямі, могуць навучаць іншых і даводзіць свае думкі да шырокага кола людзей. Камунікабельныя, практычныя і адказныя асобы, яны любяць усё пачынаць з пачатку, ганарацца сваім рацыяналізмам і заўсёды пераканаlittleны ў сваёй праваце. Стыхія крызісу для іх не больш чым часавая перашкода і ўрок жыцця. Вялікія амбіцыі прыносяць іміджу: для задавальнення сваіх амбіцый яны допускаюць шмат несумленнасці. І паколькі давер для іх жыццёва важны, ім варта імкнуцца па магчымасці апраўдваць яго, не падыходзячы да прорвы, а накіроўваючыся правільным шляхам.**

## Даты Падзеі Людзі

**30 СТУДЗЕНЯ**

**1833** год — нарадзіўся (вёска Уборкі, цяпер Бярэзінскі раён) Апалінарый Гіляравіч Гараўскі, беларускі жывапісец, партрэтыст. У 1855 годзе скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў, удасканальваў сваё майстэрства ў навучальных установах і студыях Жэневы, Дзюсельдорфа, Рыма і Парыжа. У 1860-80 гадах жыў у маёнтку Уборкі, шмат падарожнічаў па Беларусі, Расіі, Украіне, робячы накіды і замалёўкі. У зімовы час жыў у Пецярбургу, дзе выкладаў у мастацкай школе Таварыства заахвочвання мастацтваў. Разам з братам Іпалітам дапамагаў П. Траццякову фарміраваць мастацкую калекцыю. Стварыў шэраг карцін, якія апяваюць беларускую прыроду, народны побыт: «Балота», «Ліпы», «Вечар у Мінскай губерні» і іншыя. Найбольш вядомыя партрэты К. Салдаценкава, Ф. Бруні, М. Глінкі, «Партрэт селяніна». Каля 40 карцін мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Памёр у 1900 годзе.



**1895** год — 120 гадоў таму нарадзіўся (вёска Мышкавічы, цяпер Кіраўскі раён) Кірыл Пракопавіч Арлоўскі, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізатар калгаснай вытворчасці, Герой Савецкага Саюза (1943), Герой Сацыялістычнай Працы (1958). У 1918 годзе ў час германскай акупацыі Беларусі па заданні Бабруйскага падпольнага райкама РКП (б) арганізаваў і ўзначаліў на радзіме партызанскі атрад. У 1920—1935 гг. быў у органах АДПУ і НКУС. Са студзеня 1922-га да канца 1925-га — камандзір партызанскага атрада ў Палессі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У якасці камандзіра разведвальна-дыверсійнай групы, якая дзейнічала ў тыле праціўніка, ваяваў на баку рэспубліканскага ўрада ў грамадзянскай вайне ў Іспаніі ў 1936—1939 гг. У 1940—1942 гг. выконваў спецыяльнае заданне ў Кітаі. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 года быў на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Арганізатар і камандзір партызанскага атрада «Сокалы», які 17 лютага 1943 знішчыў «галоўнага камісара» Баранавіч. У гэтым баі Арлоўскі атрымаў цяжкае раненне, у выніку якога страціў абедзве рукі і слых. З 1944 года быў старшынёй калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна, які пад яго кіраўніцтвам стаў буйной шматгаліновай гаспадаркай. Памёр у 1968 годзе.

**1930** год — ЦК ВКП(б) зацвердзіў тэкст пастановы «Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі», якая санкцыянавала канфіскацыю маёмасці, масавую высылку грамадзян на пасяленне ў неабжытыя раёны і іншыя рэпрэсіўныя меры ў дачыненні да «кулакоў». 4 лютага 1930 года была зацверджана інструкцыя ЦВК і СНК саюзным рэспублікам, краям і абласцям пра ўскладанне на АДПУ арганізацыю «раскулачвання».

## Было сказана

**Сомерсэт МОЭМ, англійскі пісьменнік:**

*«Каханне памірае. Найвялікшая трагедыя жыцця заключаецца не ў тым, што людзі гінуць, а ў тым, што яны перастаюць кахаць».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.093. Індэкс 63850. Зак. № 287.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 студзеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12